Голы
звер

Міхась Зарэцкі

Голы зьвер

Дзяржаўнае
Выдавецтва
Беларусі
Менск
1926

МІХАСЬ ЗАРЭЦКІ

ГОЛЫ ЗЬВЕР

(АПОВЕСЬЦЬ)

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
МЕНСК—1926

„БДВ“ № 73. Галоўлітбел 15
Менск, 1-ая Дзярж. друк. Зак. № 358. У ліку 4000 э

I

— Ха-ха-ха!.. Ха-ха-ха!..

Сьмешна Яроцкаму. Ну, ня стрымаць проста. Сьмех шалёнай вужакай абвівае нутро і цісьнецца-цісьнецца вон, каб рассыпацца ў рогат гульлівы.

Ну, ня стрымаць. Аж дрыжыць усё цела, калоціцца.

— Ха-ха-ха!.. Хі-хі-хі-і-і...

І радасна, добра.

Вольна, як птушцы ў блакітным узвысьсі.

Мяккі прытульны вагон нахаду аднамерна парыпвае. У гэтым рыпеньні—тлустым, лагодным—нібы адгалосак сьмеху Яроцкага. Нібы сьмешна й яму—гэтаму сытаму мляваму вагону, сьмешна й радасна разам з Яроцкім.

— Кох-кох-кох... Кох-кох-кох...

Ну, да-душы-ж, ён падсьміхаецца. І нават міргае таемна так, ласкава сваймі распаўзьлівымі ценямі.

І дзіўна, чаму не сьмяецца гэты гандляр, о скручыўся вунь на верхняй паліцы. Сьпіць ён ці што — чорт яго ведае. Пуза толькі відаць Яроцкаму і барада. Барада вытыркнулася нярухома і суха, як у мерцьвяка.

— Ах, барада... барада... Ха-ха-ха...

У таго—у дурня таго—тож барада. Як недалужна, убога траслася яна на судзе. Бедная бародка. Яна так сьмешна чарнелася на зьбялелым ад страху твары, быццам адчувала сябе не на месцы, гатова была сарвацца, уцячы, пераскочыць на голы, але важны твар старшыні.

Весела, сьмешна было.

Як злосна барадач гэты зірнуў на яго пасьля прыгавору. А як ён крыкнуў:

— Падвёў, пагубіў!..

— Ха-ха-ха... Ну і падвёў, пагубіў. А сам выкруціўся, сам буду жыць, бо хачу жыць і ўмею...

Яроцкі салодка ўсьміхнуўся.

Ён здаволен сабой. Ён моцны, разумны. Ён бярэ ад жыцьця ўсё, што захоча. Для яго няма недаступнага. Усё ў яго волі.

Успомнілася, як валяўся ў нагах у яго барадач, як плакаў, маліў:

— Пашкадуй малых дзетак... Бяры ўсё, што хочаш, што хочаш рабі, толькі вызваль. Пагінуць усе...

— Дурань стары... Ха-ха... дзеткі... Думаў—пашкадую, заміж яго сяду ў турму... Хо-хо, чаго захацеў.

І злосьць узьнялася ў Яроцкага на дурасьць людзкую.

Успомнілася яшчэ Натальля. Тож плакала, корчылася. Прасіла, каб узяў з сабой, каб ня кідаў. І яна—як згаварыліся—тож усё:

— Падвёў... Пагубіў...

Нібы слоў больш ня ведаюць.

Яроцкі зусім раззлаваўся. Прыкра стала, пагасла радасьць, здаволеньне. Лёг на канапу, каб заснуць. Паляжаў, паварочаўся, але не заснуў. І здалося, што гэта перашкаджае напорна-пісклявы храп з верхняй паліцы. У вочы агіднаю плямай уткнулася круглае пуза. Ух, распароць-бы яго!

Устаў, штурхануў. Той здрыгануўся спрасонку.

— Га? Што?..

— Куды едзеце?

— У Гомель... А што?..

— Больш нічога...

— Дык што вы мяшаеце спаць?

— Сьпеце, колькі ўлезе... Праваднік!.. Праваднік!..

Гыркнулі дзьверы.

— Вы мяне клікалі?

— Як прыедзем у N, разбудзеце...

— Слухаю...

Зноў ціха, спакойна. Вагон курлыкае ласкава.

Па целе млосьць, пацягушкі. Значыць—можна заснуць.

II

Гэта ўсё было ўладжана ў адзін дзень.

Так. Зранку Яроцкі нікаў па розных канцох гораду, выслухваў, вынюхваў, часам распытваў нешта, а ўжо з паўдня прышоў у кантору.

— Кантора якая... Так, толькі назва адна. Вывеска толькі. А ў сярэдзіну ўвойдзеш, дык во яна ўся: стол, пакрыты залупленай, бруднай паперай, два растапыраных крэслы, ложак ля сьценкі, другі пакалечаны стол. А на сьцяне жоўты змарнелы малюнак. Яшчэ: за сталом, упяўшы вочы ў паперы,—мужчына чарнявы. Барада лапаткай, вусны чырвоненькім бантікам і вочы наіўна-скругленыя, нібы ў задзіўленьні.

Яроцкі заціснуў у вуснах тонкую ўсьмешку. Падумаў:

— Ізноў барада. Гэта добра... Ха-ха...

А зьвярнуўся з праставатай, ветлай сур'ёзнасьцю:

— Дзень добры. Скажэце, калі ласка, гэта вы будзеце старшыня крэдытнага таварыства?

— Я. Добры дзень... Шчупак.

Ха-ха! Гэта ён прадставіўся, прозьвішча гэта. Ды гэтак-жа важна, з рызыкай.

На вуснах Яроцкага зноў тоненькі хвосьцік усьмешкі. Але трэба трымацца. Трэба іграць. Кошка і мышка. Ха-ха!

— Я чуў, што вам трэба бухгальтар. Я хачу паступіць.

Шчупак сабраў твар у салодкую міну.

— Бачыце... Я вам так скажу... Наша таварыства вельмі слабенькае. Бедненькае... так. зусім небагатае... Я ня ведаю, як вам тут, ці ўпадабаецца... Бачыце... у нас... хе-хе... з пэнсіяй не асабліва...

Яроцкі зусім ужо наіўненька, палахліва:

— А колькі?

— Трыццаць пяць. Усяго толькі... Бачыце?

Часінку падумаць, паморшчыць лоб, быццам мяркуючы, узьняць вочы ўгару, патарабаніць пальцамі аб стол,—гэта Яроцкаму не пяршыня.

— Я згодзен.

— Згодны? Так.. ну-с.. э-э-э.. хм..

Гэта Яроцкі тож ведае.

— Будзьце спакойны... Практыку маю, курсы прашоў спэцыяльныя... Вось дакуманты.

Шчупак вочы прыжмурыў, надуўся, чытае.

— Так... эге... так... ну... Добра, усё добра. Калі вы можаце стаць на работу?

— Я магу заўтра. А сёньня ў мяне ёсьць трохі часу, дык, калі дазволіце, я пазнаёмлюся з вашымі кнігамі...

— Калі ласка... Сядайце вось тут. Я зараз дам...

І тады Яроцкі забыўся на ўсё, акунуўся ў стракатае мора лічбаў. Ён арудваў імі з надзвычайным спрытам. Яны паслухмяна перабягалі ў яго галаве, зьбіраліся ў купы, зноў разьбягаліся плоймай пярэстай, каб даць месца абрыўкам парваных ліхаманкавых думак.

— Актыў... пасыў... дэфіцыт... ніякіх комэрцыйных зваротаў... 3685... Эге... Халасьцяк, пэўна, бо ложак стаіць... Прыбытку.. сальдо... дурань, відаць, таксама... 7932... Тут можна дотацыю... хм... Няпрыметна, каб... Ага... так... патрошку, на працягу... Студзень, люты... Мой будзе, ясна... Разам 8430... Ага...

А рукі нэрвова перабіралі шапялявыя старонкі старых замызганых кніг.

III

Так звычайна выходзяць на паляваньне.
Уявеце сабе...

Паслалася пухавай бельлю шырокае поле. Аж дакуль вока захопіць—мяккі ватовы дыван. А з боку—чорны аголены лес узьняў сваё вецьце драцянае, бясстыдна раскрыў на паказ свае мёрзлыя нетры.

Хітры лес, дармо што прыкінуўся ціхенькім, просьценькім, быццам хоча сказаць:

— Наце, шукайце. Далібог-жа нічога няма. Далібог не схаваў нічагутка...

Эге! Выбачай, не паддурыш. А вунь пад ахутаны сьнегам кусьцік яленцу гэта якія пабеглі сьлядочкі? А вунь там, пад сіняй разложыстай хвояй, хто натаптаў так багата? Не, брат, пастой!

І ажывае нутро застыглага лесу. І мятусяцца ў напружаным воку здані гарэзьлівых зайчыкаў, спрытных лісіц. І вуха напятае ловіць нячутныя шолахі, ловіць празрыстую музыку мёрзлага лесу.

Што гэта? Праўда, ці не? Ці гэта толькі здаецца, ці й сапраўды жыве гэты лес, жыве настарожаным ціхім жыцьцём, застыглым у нейкім маўклівым чаканьні?

Ага! Вунь-вунь, там...

З-пад зялёненькай елачкі выскачыў зайчык. Прыстоіў, замёр,—толькі вушкі так сьмешна, так прытка рухаюцца.

Які ён прыгожы, гэты зайчонак! Колькі ў ім зграбнасьці сьвежай, крамянай! Колькі ў ім дзікага вольнага спрыту! Колькі жыцьця!..

А сэрца ўжо тукае прагна, настойна.
А рукі трасуцца, стрэльбу сьціскаючы...

Але ўсё гэта проста да рэчы. А справа ня ў тым.

Цяпер пра Лідачку.

Лідачка бегла пасьпешна па вуліцы, ёмка праціраючыся праз шчыльны натоўп падарожных, наіўна й задорна выкручваючы зграбнай фігуркай. У Лідачкі ў руках паўтары кніжкі і сшытак, а ў вачох цэлае сонца гульлівай дзявоцкай вясёласьці. Ад гэтай вясёласьці неяк асабліва радасна іскрыцца наволкал сьняжок і асабліва прыветныя перабягаюць усьмешкі па тварах мужчын.

На рагу Савецкай і Комсамольскай Лідачку ўбачыў Яроцкі.

Ён ужо трэці дзень выходзіць на вуліцу з пэўным замерам. Ён ужо трэці дзень угледаецца пільна у твары хаджалых, быццам шукаючы нечага.

— Так, звычайна, выходзяць на паляваньне...

Убачыўшы Лідачку, Яроцкі спыніўся. Азірнуў яе ўсю сьмелым поглядам, усьміхнуўся здаволена.

— Красуня!..

Лідачка яго таксама заўважыла і на ўсьмешку адказала дражлівай грымасай. Тады ён дагнаў яе.

— Выбачайце... Ведаеце што? Вы надта прыгожая дзяўчына, сапраўды...

— Я й бяз вас гэта ведаю. Больш нічога ня скажаце?

— Магу сказаць тое, чаго вы, пэўна, ня ведаеце.

— Ну?

— Вы мне ўпадабіліся.

— Ага! Гэта я таксама ведаю...

А вочкі гараць. А вочкі кідаюць гарэзныя іскрачкі. Яроцкі іх ловіць сваімі вачмі і адчувае з уцехай, як яны мякка казычуць нутро, абураюць сэрца лёгкім запалам.

— Мо' яшчэ скажаце што?

Які галасок мілагучны! А вусны дрыжаць. Яшчэ момант, здаецца, і пырсьне са сьмеху.

— Мне з вамі прыемна. Я правяду вас, калі дазволіце.

— Калі ўжо так хочацца вам, дык што-ж... можна, я дазваляю.

Зьвярнулі за рог. Тут мала людзей. Тут лепш адчувае чалавек чалавека. Тут, здаецца, больш сьнегу, больш сонца, больш гэтай яснай марознай празрыстасьці, што ўлівае ў нутро здаровую сьвежасьць, што паліць на твары чырвань вясёлую.

Яроцкі глядзіць на дзяўчыну, любуецца. Салодка жмурацца вочы, туманяцца жарам вільготным. Гаворыць вуснамі толькі аднымі, бо гаворыць адно, а другое на ўме.

Так узяць-бы яе—любую, сьвежую—узяць, як цукерку, як дарагі падарунак-гасьцінец і гладзіць, гладзіць. Не цалаваць, не Потым хіба...

А сэрца ўжо тукае прагна, настойна...
Так звычайна выходзяць на паляваньне.

IV

У кантору вуліца ўглядаецца халодным бясьсьветна-вадзяным вокам—на дварэ хмарна, адліга. Здаецца, ужо змрок надыходзіць, а яшчэ тры гадзіны ўсяго. Ды яшчэ вокны ў канторы невялічкія, брудныя—зусім шэра і цёмна.

Настрой у такую пару бывае цягучы, санлівы. Праца цяжарыць, па целе тупая нейкая млосьць. Толькі сесьці ў куток, прыхінуцца да печкі і гаварыць, расказваць што-небудзь з мінулых дзён, успамінаць тое, што ўелася яркім рубцом у нутро і абрасло, абгладзілася прыгожым мохам даўнасьці. А калі не ўспамінаць, дык марыць на будучыну, будаваць адважна-шырокія пляны.

Шчупак пацягнуўся, устаў. Пахадзіў па пакою, пракурлыкаў нейкую песьню і стаў, абапёршыся аб печ, у кутку. Па яго круглых адкрытых вачох скаўзануўся цень задуменасьці. Уздыхнуў.

— Эх-ха-ха. Віктар Андрэевіч, кіньце. Давайце пагутарым троху. Надакучыла ўжо працаваць. Лічбы, лічбы—прасьвету няма. Хутка зусім высахнуць мазгі. Ведаеце, колькі працую я на гэтай дурацкай рабоце?—Пятнац-

цаць год. Дзень у дзень усё адно і адно. Галаву забіваеш гэтымі лічбамі, тупееш, зусім ня чуеш жыцьця.

— А вы кіньце.

— Ха-ха! Есьці кінуць няможна. Хочацца усё, як ні круці.

— За другую працу вазьмецеся.

— Што вы? За якую другую? Я калісьці ў дзяцінстве дудкі з вярбы рабіў, ды яшчэ з дзягелю майстраваў спрытныя пырскаўкі. А больш спэцыяльнасьці ніякай ня помню. Вось і вазьміся за якую працу.

Яроцкі ўстаў, захадзіў па пакою.

— Так, гэта кепска. Я таксама ня маю ніякай спэцыяльнасьці. Але я не бядую й ня сохну. У мяне нейкі д'ябальскі спрыт да жыцьця. Я ўмею здорава жыць. О, помню, у N што мы рабілі! Мы ўвесь горад дыбарам ставілі! Там я працаваў па коопэрацыі. Мы там разгарнулі шырокую справу. За поўгода, пакуль я там быў, аснаўны капітал павялічылі на 100 проц... Ну й монэта не пераводзілася... хе-хе... У грашох ня было недахвату... Бывала, як загуляем, закуцім—уга!..

— Некаторыя добра жывуць, гэта правільна.

— Помню, нешта раз заключылі мы ўмову з трэстам. Добрыя хлопцы! Ну, праўда, зрабілі так, што і ім і нам... хе-хе... Дык мы

тады цэлых тры дні без адхлыну гулялі... Дзяўчат панабралі, залезьлі ў нейкі цёплы прытулак на край гораду... І чаго толькі там не рабілі... Эх, дабро!.. Ёсьць што ўспомніць часамі... Быў у нас адзін старыкан, дзядзя Косьця мы звалі яго. Дык ён—ведаеце, што вымудраў?..

І Яроцкі густымі яскравымі хварбамі стаў маляваць вострыя сцэны гулянкі, распусты.

Ён мастацка расказваў. Ён умеў захапіць чалавека, умеў да болю напінаць струны яго пачуцьця і граў на іх сьмела, рашуча, як віртуоз. Ён адразу знаходзіў у нутры чалавека інстынкты зьвярыныя і ўспарваў іх, узьбіваў у бурна-шалёную пену, каб захлынула яна ўсё нутро, каб затапіла ўсё чалавечае.

Шчупак слухаў яго, як зачараваны. Цяпер яшчэ больш скруглёныя вочы яго блішчэлі нездаровым вострым агнём, а вусны—рухавыя, мокрыя—то сьціскаліся сударгай, то распускаліся, расплываліся ў шырокую ўсьмешку-грымасу. Раз-по-разу ён корчыўся ўвесь, нахіляўся і рагатаў тонена, брудна, як якоча паршывы шчанёнак.

Не пазнаць было Шчупака.

Бедны стары халасьцяк!

А Яроцкі і сам захапіўся. Ён ужо не расказваў, не. Ён ужо прапаведваў, выкладаў сваю веру, сваю тэорыю жыцьця. У гэты мо-

мант ён быў зусім шчыры, ён гаварыў тое, у што верыў, і верыў у тое, што гаварыў.

— Ха-ха-ха! Кажуць—так жыві, а ня гэтак, тое рабі, а ня гэта. Каму якое дзела? Хто мае права мной кіраваць? Я жыву так, як хачу. Я жыву так, як мне прыемна, я хачу ўзяць ад жыцьця ўсё, што мне ўцеху дае, асалоду. Якое мне дзела, што людзям дрэнна жывецца! Ха-ха!.. Каб ня было дурняў, дык што-б тады было рабіць разумнаму?.. Я, я хачу жыць, маё жыцьцё, толькі маё, мне дарагое. І я жыву. І ні да кога мне дзела няма. Сумленьне, закон... ха-ха-ха!.. гэта-ж для дурняў, для асталопаў, для тых, хто сілы ня мае ўзяць сваю долю! А я—вышэй за ўсіх гэтых дрындушак... Я—сам сабе пан...

Слухаў Шчупак і прад ім, у вачох яго шырока-зьдзіўленых, расла, узвышалася постаць Яроцкага, пакрывала яго сваёй буянасьцю, прыціскала цяжкім аўторытэтам, дражніла салодкасьцю дзікай злачыннасьці.

І жыцьцё ўсё, поўнае працы сухой, аднастайнай, здавалася згубленым, пустым, як бясплоднае поле.

Ужо сьцямнела, і яны вышлі з канторы. Пашлі разам.

У той вечар Шчупаку няпрыемна было з няпрывычкі піць салодка-даўкую гарэлку і

дужа прыемна было потым, едучы на рыпучым вазку, абмывацца сьвежым марозам.

У тую ноч Шчупак першы раз за сорак год свайго жыцьця спаў з простытуткай і выклаў з кішэні апошнюю, разьмеркаваную на тыдзень, пяцёрку.

V

Ой, гэта жаночае сэрца! Яно такое мяккае і падатнае, як здобнае цеста, і ўвайсьці ў яго, калі захочаш, так лёгка, як лёгка збрадлівай карове ўлезьці ў чужое дабро.

Не здарма-ж матка Лідачкі пакахала Яроцкага больш, як дачка; не здарма-ж, калі прыходзіў Яроцкі, яна, падпёршы рукой бараду, падоўгу ўглядалася ў яго салодкім ласкавым поглядам, песьцячы недзе глыбока-глыбока ўнутры палахліва-ружовую думку.

І браценьнік Лідачкін тож пакахаў дзядзю Віцю. Дый як не кахаць, калі ён заўсёды цукеркі прыносіць і так высока-высока гоўтае на назе, што аж дух зацінае.

А сама Лідачка жартуе, гарэзуе, як дзіцянё. Яна сварыцца з Яроцкім, заўсёды сварыцца. І будзе сварыцца, цэлы век будзе сварыцца, бо ён занадта думае аб сабе, а на яе глядзіць з нейкай паблажкай. І яна не пакажа яму, не пакажа ніколі, што ён падабаецца ёй. Ого, яму толькі дай зразумець!..

І, калі прыходзіць Яроцкі, Лідачка з усяе сілы моршчыць свой твар, каб вышаў сур'ёзны і бязуважны, каб паказаць яму, што яе зусім ня радуе тое, што ён нарэшце зьявіўся А сэрца-ж ня ўбачыш, як яно тукае, як разрываецца проста ад радасьці. О, каб убачыў ён сэрца!

Яроцкі часта ходзіць да Лідачкі. Ён упарты і рашыў дасягнуць таго, што намецiў.

У Лідачкі ён пазнаёміўся з Горскім, іхным кватарантам.

Вось іх першая гутарка:

— Вельмі прыемна. Яроцкі.

— Горскі. Вы, здаецца, нядаўна прыехалі?

— Так, два тыдні ўсяго. Мабыць, хутка й паеду.

— Чаму?

— Не магу. Не магу доўга сядзець на адным месцы. Цягне нешта, штурхае ў новыя гарады, да новых людзей, да сьвежых уражаньняў.

— Хм... Гэта, мабыць, ад тэмпэраманту.

— Мабыць.

Потым маўчалі троху, пакуль ня стала нялоўка. Тады Горскі спытаўся:

— Вы дзе працуеце?

— У коопэрацыі. А вы?

— У політасьвеце.

І ўсё.

А вось іх думкі аднаго аб адным.

Яроцкі аб Горскім:

— Пэўна, комуністы. Ня дурны, відаць па ачох. Трэба асьцеражней. —

Горскі аб Яроцкім:

— Хлюст.

Лідачку аднаго разу Яроцкі запрасіў у тэатр. Як ішлі ў тэатр, жартавалі, сьмяяліся, штурхалі адзін аднаго. А назад ішлі моўчкі. Было ціха, бязьлюдна, гарадзкі спакой—чулы, старожкі—навяваў палахлівы смутак, і Лідачка мякка тулілася да рукі Яроцкага.

Яроцкага дражніла блізкасьць Лідачкі, яе маладога сьвежага цела. Ноч спакушала сваёй глухатой і бязьлюднасьцю, і цяжка трымацца было, каб не схапіць, ня сьціснуць яе, гэтую мілую дзяўчынку, такую прывабную ў сваёй мяккай, яшчэ дзіцячай, наіўнасьці.

А Лідачка ўсё бліжэй, усё шчыльней тулілася да яго, люба зьвінела сваім галаском:

— Ну, кажэце што-небудзь, расказвайце. Чаго маўчыцё, як воўк? Раскажэце што-небудзь цікавае. —

Тады ён пачаў гаварыць. Дзіўны быў голас яго—грубаваты, абрыўчаты і нейкі глухазатоены.

— Лідачка! Ці любілі вы калі? Вы ніколі яшчэ ня любілі? О, вы ня ведаеце, якая гэта радасьць... Я знаю... Я праўду кажу... Гэта

такая дзіўная, нявымоўная асалода, за якую можна многа аддаць... Вы палюбіце мяне... Лідачка, палюбіце... Я навучу вас, як знаходзіць сабе шчасьце... Я навучу вас, як шэрае нуднае жыцьцё можна акввяціць пастаяннай уцехай і радасьцю. Я шчасьлівы чалавек, Лідачка, моцны чалавек. Я знаю жыцьцё, я яго вывучыў...

Лідачка маўчала. Лідачка не магла гаварыць.

Аб чым ён гаворыць? На што ён думку наводзіць? Які ён дзіўны, таемны! І як прыгожа блукаюць чорныя цені на яго цьвёрдым, сур'ёзным твары!

О, нашто ён прыгожы такі!

І да самае хаты Лідачка не сказала нічога. А ў хату ўвашла ціхая, задумёная.

Горскі ня спаў яшчэ. Ён сядзеў у залі і нешта пісаў. Ён заўсёды многа працуе, сядзіць начамі.

Сярдзіты, насуплены. Відаць, злуецца на Лідачку. Мо' ён кахае яе?

— Хай сабе! Хай сабе! Хай злуецца. Ня трэба мне. Ня трэба яго каханьня!.. Доўганосы...

Тая глухая зімовая ноч доўга паўзла для Лідачкі. Плакала Лідачка ў тую даўгую цягучую ноч.

VI

Увага!

Я буду гаварыць аб першым каханьні дзяўчыны, аб тым, як красуецца пышнымі краскамі маладая душа, чыстая, як нябесны блакіт, і глыбокая, як марское прадоньне.

Я буду гаварыць аб вясьне некранутага сэрца, аб тым, як салодка поўніцца яно мядовымі ўзмывамі, як бруіцца яно пералівам дзівосным і разьліваецца буянай, атрутнай паводкаю.

І яшчэ вось аб чым будзе мой сказ. Аб тым, як спрытны ліхі паляўнічы завабіў у сеткі свае дарагую дзічыну.

Увага!

Сэрца цьвіце. У ім пеніцца чырваньню сьвежай нязнаная радасьць. У ім—новая песьня, зьлітая з вострых магутных акордаў.

Як прыемна, як радасна плысьці ў гэтым ружовым тумане, што затуляе розум, прытомнасьць, што абмывае нутро такімі пякучымі хвалямі. Як прыемна, як радасна чуць гэту жаркую блізкасьць, гэту сьмелую сілу, што цягне к сабе, прымушае забыцца на ўсё, на ўсё-чыста і глядзець бясконца ў дзіўна-глыбокія чорныя вочы.

На дварэ завіруха. Скавыча вецер за рогам, плача аб нечым, ці што. Мо' гэта ў некага гора няшчасьце якое, і ён так галосіць, заве на ратунак? Роем пасланцы прылятаюць—сьняжынкі сухія, халодныя—і ў зморы ня могуць крыкнуць, ляпнуць у шыбу, а толькі шэпчуць бясьсільна там, за акном:

— Выйдзі, выйдзі... Зірні...

Ён бярэ за рукі, сьціскае. Ён глядзіць у самае сэрца сваімі вачмі—дзіўна-глыбокімі, цёплымі. Яго вочы гладзяць, галубяць, у іх так многа пяшчоты. Цягнуць, цягнуць гэтыя вочы, адбіраюць сілы, поўняць салодкім бязвольлем.

— Любы! Які ты прыгожы!

Ён абымае сваімі дужымі рукамі. У яго руках так жарка, так добра. Такая гарачая па целе млосьць.

Як прыемна ляжаць у яго на грудзёх! Якія балючыя яго пацалункі!

— Любы! Ты мучыш...

Сьнег. Сьнег. Сьнег.

Нашто гэтыя ліхтары па дарозе? Нашто яны так хітра міргаюць скрозь завіруху? Хай-бы лепш зусім цёмна было, каб нічога ня бачыць, каб было адно сьнегавое радно непрагляднае, каб толькі слухаць, слухаць...

Вые мяцеліца, гоніцца ўсьлед. А вазок імчыцца-імчыцца ў шэрую муць, у прастор завірухі шалёнай, быццам хоча дагнаць вяртлява-звонкую песьню званочкаў.

Як шырока, як вольна!

— Любы! Мацней прытулі... Мне халодна... Мне добра... А табе?..

Што гэта? Нібы зорачка там, на краю бялясага неба? Адкуль яна?

— Зорачка! Любая зорачка! Ты дрыжыш, ты зьмёрзла зусім... Адзінотная, бедная зорачка. Ці любіш ты? Ці ёсьць у цябе хто, каб прытуліцца вось так, каб сагрэцца?

Бедная зорачка!

Бедны далёкі званочак!

— Любы! Кахай мяне... Кахай мяне так заўсёды!..

VII

А ці бачыў хто, як разувае Шчупак новыя боты?

Вось ён пачынае. На пэўным месцы, пад этажэркай у яго ляжыць спэцыяльная шмотка. Ён дастае гэту шмотку й сядае на зэдлік. Часінку сядзіць нярухома, паклаўшы на калені рукі і распусьціўшы ў прасьцяг тупы погляд круглых вачэй.—Адпачывае. Шмотка, як шы-

бельнік, недалужна зьвісае з калена. Потым, схапянуўшыся, ён павольна моршчыцца, чэша сярэдзіну і асьцярожна выцягвае ўперад нагу. На насок бота ён расьцілае шмотку, кладзе другую нагу і зноў хвіліну сядзіць нярухома. У гэты момант ён думае:

— Заўтра трэба канечна падвесьці баланс... Так... Трэба, ня йначай...

І бярэцца за бот. Цягне яго ён спакваля, з перадышкай, цягне сур'ёзна, зморшчыўшы лоб і прыкусіўшы губу. Калі дрэнна ссуваецца бот, ён гладзіць халяву і адначасна ўсьміхаецца сам сабе, задраўшы ўгару галаву.

— Эх, хром... Любата... Такога ня ўсюдых і знойдзеш... Гумаляст, адным словам...

А зьдзеўшы бот, Шчупак доўга яго разглядае, засувае ў халяву руку, шчупае зьверху й спадыспаду, стукае пальцам падэшву. Усьмешка ўжо ня спускаецца з твару яго.

— Гэта дык боты... Боцікі, а ня боты. Арэх!..

Боты ён ставіць каля ложка, у галавах, а анучкі (усяго восем штук) расьцілае па хаце. Печка халодная, а так усё-ткі большы доступ паветра—лепш высахнуць.

З ботамі кончана. Але спаць Шчупаку нешта ня хочацца. Таму ён стаіць некаторы час сярод хаты, спусьціўшы сваю барадзёнку, і аб нечым панура думае.

Хто яго ведае! Можа ў гэту хвіліну ў яго цяжкім уяўленьні ціха лунае вобраз невядомай жанчыны—ласкавай і руплівай, якая некалі прыдзе к яму, каб сваёй ветлай гаспадарскай рукой прыхарошыць жыцьцё яго халасьцяцка—бязладнае?

— Якія брудныя анучкі!

Потым ён падыходзіць да шафы, адчыняе віхлястыя дзьверы і дастае новенькі фрэнч. Калі ён глядзіць на фрэнч, яму ўспамінаецца Яроцкі. Ён уздыхае...

— Расхадовы хлапец... Падвядзе, сукін сын... Тады сьвісьнеш...

Але фрэнч такі зграбны, сукно дык аж зьзяе. І мякенькае і гладзенькае.

— Памераць.

Ён надзяе фрэнч, бярэ мізэрнае бруднае люстэрка і пачынае перад ім рабіць выкрунтасы, стараючыся з усіх бакоў агледзець сваю фігуру. Здаволены, ён ставіць люстэрка і ходзіць важна па пакою, салодка адчуваючы на сабе новенькі, шчыгульненькі фрэнч.

У гэты момант нехта грукае ў дзьверы. Па твары Шчупака крывой грымасай спалох. Ён, як злодзей, якога злавілі на месцы злачынства, зьдзірае пасьпешна фрэнч, пхне яго ў шафу. На твары астаюцца плямы сарамяжлівай чырвані.

У дзьверы шалёны грукат. Урэшце ён адчыняе.—Яроцкі.

Яроцкі—сьвежы, сьцюдзёны, ад яго блізкасьці па целе перабягаюць шчыпучыя мурашкі холаду. І дзьверы не зачыняе, чорт. Увесь дух выпусьціць.

А твар у Яроцкага чырвоны, гарачы. Ён п'янаваты, вясёлы. Як увашоў, так і пасігаў шырокімі мокрымі крокамі па разасланых анучках. Ня чуе, што Шчупак лаецца, падбіраючы за ім сваю маемасьць. Яроцкі сваё:

— Шчупак! Скажы мне на ласку: ці ведаў ты дасюль, што ты дурны чалавек?.. Ты-ж дурніца, сапраўды. Адно: ты сядзіш у хаце ў той час, калі ўсякае жывое стварэньне жыве... Ты знаеш, што значыць—жыць? Шчупачок, ты-ж чалавек барадаты. Скажы, што значыць жыць? Ня ведаеш? Эх, дурань, дурань... Кінь анучкі, Шчупак, яны брудныя і сьмярдзяць. Знаеш што? Учора я ўжо тае... з тэй дзяўчынкай, помніш, ага? Яна яшчэ цэленькая... была... Хочаш, Шчупак, я табе яе перадам, як надакучыць? Знаеш, Шчупак, у дзяцінстве для мяне было самай лепшай забавай псаваць якую-небудзь прыгожую новую рэч... Мяне білі за гэта... Нешта, помню, я ўкраў у маткі яе дарагі новы капялюш. Я, як злодзей, пракраўся з ім у хмызьняк і там гэту прыгожую багатую рэч расшкуматаў у пэтлухі. Аб гэтым

не даведаліся і ня білі мяне... А цяпер я з людзьмі так... ха-ха... Шчупак, я зьвер, да-душы, зьвер. Мне дужа лёгка загубіць чалавека. Я й цябе пагублю, да-душы пагублю... А? Спалохаўся? Дрыжыш?.. Ха-ха... не, ня бойся, ты мне непатрэбен... Мо' ты хочаш грошы? Я дам... Гэта-ж нашы супольныя... Хопіць...

Шчупаку—беднаму барадатаму Шчупаку—цяжка ад гэтых вар'яцкіх слоў. Не разумее ён. Яроцкі—загадка. Яроцкі палохае, жудасьць наганяе і разам цягне да сябе, вабіць, абуджае сымпатыю. Вось хочацца проста абняць яго, як дзяўчыну, або пацалаваць у руку. Ён дзіўна-прыгожы сваёй першабытна-дзікай сілай, сваёй зьвярынаю сьвежасьцю.

Не, ён не пагубіць. За што ён будзе губіць яго, Шчупака? Шчупак яму нічога благога ня хоча і любіць яго. Яны—прыяцелі шчырыя. І хочацца гэта адзначыць, выказаць неяк.

Ён насуплівае бровы, выпукляе трубачкай чырвоныя вусны і гаворыць груба, наіўна:

— Яроцкі! Ты, чорт, дужа сымпатычны хлапец... Я, халера, люблю цябе, да-душы...

— Ха-ха-ха... Ты струсіў, Шчупак, паддабраешся?.. Ты любіш мяне?.. ха-ха-ха... Дурань ты барадаты!

Шчупаку стала сорамна, крыўдна да болю, да сьлёз. Так бывае дзіцяці, калі яно, поўнае

шчырай пяшчоты, бяжыць да маткі, каб прыгалубіць яе, пагладзіць ёй твар сваёй слабенькай ручкай і раптам сустракае нечакана-жорсткую сухую лаянку.

Шчупак насупіўся, змоўк. А Яроцкі думаў аб нечым. Раптам ён страпянуўся.

— Ну, Шчупак, надзявайся. Паедзем са мной.

— Куды?

— Туды, да дзяўчыны маёй...

— Што ты, здурэў?.. Сярод ночы?

— Дзе табе ноч? Адзінаццаць гадзін толькі... Едзем.

Шчупак паслухмяна стаў абувацца. Яроцкі хадзіў па пакою.

— Ну, гайда! Паехалі...

У Лідачкі яшчэ ня спалі. У сталбуцы над шырокім сталом, засланым кляёнкай, прыветна гарэла вісучая лямпа. За сталом сядзела Лідачка і чытала. Матка дабрадушна схілілася над швівам, а малы, седзячы на падлозе ў фанэрнай скрынцы, катаўся на аўтомобілі.

Шчупаку Лідачка здалася надзвычайна прыгожай. У просьценькай шэрай сукенцы, валасы ў косы сьціпла заплецены, твар такі мяккі, прыветны.

І пра гэту дзяўчыну ён так казаў... Няўжо гэта праўда? Ды каб гэта на Шчупака, дык ён-бы, здаецца, і прыткнуцца да яе не па-

сьмеў. Яму каб толькі глядзець на яе, каб многа глядзець, лашчыць, галубіць поглядам толькі, дык нашто лепшае шчасьце!..

Яроцкі ўраз разарваў сваім гучным размашыстым голасам пялёнку мяккай прытульнасьці, што спакойна грэлася ў цёплым пакоі.

— Добры вечар!.. Будзьце знаёмы—мой барадаты прыяцель. Гапна Кандратаўна! Мы з вамі столькі ня бачыліся! Як вашы зубы? А, галапуп! Скач сюды, падшывалец.

Матка ўсьміхалася, Лідачка рагатала, а малы пішчэў ад давольнасьці.

Шчупак маўчаў.

Праз хвілін пяць Яроцкі падняўся.

— Ну, Лідачка, паедзем катацца.

У Лідачкі загарэліся вочы, але нясьмела зірнула на матку. Тая падатна ўсьміхнулася.

— Толькі вяртайся хутчэй.

А Шчупаку зусім не па сэрцу. Як гэта— на мароз, куды—нямаведама... Чаму-б не пасядзець тут, у хаце... Пагаварылі-б, у карты згулялі. О, ён-бы зараз тож разышоўся... Ён-бы паказаў, як часамі ўмее ён жартаваць, анэкдоты расказваць, асабліва гуляючы ў карты.

І яна-б тут... Глядзець на яе, любавацца. Эх, гэты Яроцкі!..

Абрусамі яскравымі сьцелецца белая вуліца. Гоман, тлум, бліскавіцы гульлівага сьме-

ху, задорныя выкрыкі, пялёсткамі чыстымі песьні званочкаў, рыканьне напорнае аўтомобіляў.

- Горад жыве.

У горадзе вечарамі жыцьцё бывае вапярэстае, гучнае і б'ецца, кіпіць, як вада на нятушанай вапне. Вечарамі з нор выпаўзаюць начныя стварэньні, у якіх розныя вопраткі і адзін твар, бо ўсе хварбуюцца аднымі хварбамі і жывуць адным жыцьцём. У жыцьці гэтым няма ўздымаў, а ёсьць брудныя, калечаныя выбрыкі—на гадзіны кульгава ўскідаецца сэрца, родзіць чорна-лілёвыя радасьці. Гэта—прыгожасьць жыцьця!..

Яшчэ—вечарамі па зырліва-асьветленых вуліцах на аўтомобілях, на ліхачах, проста на возьніках, у шубах, бэкешах, у шапках кашлатых езьдзяць Яроцкія.

Так ідзе ў горадзе ноч.

Гэта—гніль, парахня.

Каля бліскучага рэсторану Яроцкі загадаў спыніцца.

— Зайдзем павячэраць.

Шчупак другі раз ужо тут, але адчувае сябе нялоўка, раскідана. Праўда, трохі лепш стала, як увашлі ў асобны пакой, як зачыніліся, асталіся ўтрох. Нават весялосьць пачала ўзьнімацца.

Многа пілі. Усе. І Лідачка тож. Яна расчырванелася ўся, і вочы яе заблішчэлі. Прыгажосьць яе цяпер нейкая вострая, калючая. У вачох—гульлівы задор, сьмеласьць. Яна бессаромна цалуе Яроцкага, абымае. Перасела к яму на калені, рагоча нядобра так.

Шчупаку ўспомнілася простытутка—худая, шурпатая. Скомчыў сэрца нейкі цяжарны боль.

Нашто Лідачка гэтак? Такая прыгожая, чыстая—нашто яна брудна так, усё роўна, як тыя, што на вуліцы шлындаюць.

А Яроцкі падлівае, прымушае піць. Віхаецца тлум у галаве, нутро ўзбураецца, гатова выліцца ў рогат зьвярыны, ці ў песьню гульлівую. Або—у сьлёзы, горкія, п'яныя сьлёзы.

Па Лідачцы плакаць трэба. Так, трэба плакаць...

А Яроцкі рагоча. Яроцкі загадаў, каб Лідачка з ім, з Шчупаком, цалавалася.

Як гэта так? Ён з Лідачкай?.. Ён і дакрануцца да яе ня важыцца. Яна-ж такая прыгожая...

Лідачка сама цалуе яго. Яна села к яму на калені, цягае за бараду, сьмяецца.

Рукі міжвольна цягнуцца, мацаюць. Гарача як!

Лідачка б'е яго па шчацэ і, сьмяючыся, перасядае к Яроцкаму.

Яроцкі ўстаў. Да яе, як да служанкі:

— Ну, хадзем!

Вышлі. Дарогай Яроцкі шапнуў Шчупаку:

— Цяпер к чортавай мацеры.

Селі на вазок. Адляцеў злосна-вісклівы званочак.

Шчупак астаўся адзін. Пастаяў хвілінку на месцы і пашоў, хістаючыся, па вуліцы. Пашоў шукаць сваю шурпатую простытутку.

VIII

Яроцкі ня быў тры дні ў канторы. За гэты час ён далікатна цііснуў дзесяткі рук і ў дзесяткі ачэй углядаўся з сяброўскаю шчырасьцю, усьміхаўся ветла, адкрыта. Ён усюды пакідаў за сабой сымпатыю, яму верылі ўсюды.

Трохі цяжка, няпрыемна было. Іншаму хочацца плюнуць у хару, таўхануць пад сківіцы, бо абрыдлі ўсе, надакучылі. А прыходзіцца скаліць прыветліва зубы і цііснуць трэсьці, цііснуць рукі—пульхныя, вялыя.

Гэта—жыцьцё. У жыцьці трэба йграць, трэба змагацца. Каб жыць—трэба быць спрытным, разумным. Трэба рваць з-пад зубоў у людзей ласы кавалак і спажываць яго пад віск, скавытаньне гэтых абдурэных дурняў.

Гэта—жыцьцёвы закон Віктара Яроцкага.

Значыць, цэлых тры дні Шпулак ня бачыў Яроцкага. Ён турбаваўся, бо ў кнігах

лыса бялелі пустыя старонкі, прасілі настойна балянсу, а звонкая скрынка з-пад грошай была пустая.

Як увашоў Яроцкі ў кантору, Шчупак, задраўшы ногі, ляжаў на ложку і глядзеў пустым поглядам у столь. Яго барадзёнка, зусім раскудлычаная, сьмешным сухім рагазьзём недалужна тырчэла ўгару, як клок сена, кінуты на дарозе. Яроцкаму брыдкім здаўся Шчупак; захацелася пхнуць яго высьпеткам, як сабаку паршывую.

Але не, нябожна. Рана яшчэ, яшчэ гэты дурань нікчэмны павінен служыць. Трэба і з ім так, як з тымі.

— Здароў, Шчупак! Ну, як ты тут маешся? Па мне замаркоціўся?

— Чакаў цябе. Так-жа нябожна. Зьбег невядома куды, а тут—сам знаеш, парадак які.

— Я, брат, рабіў вялікую справу. Я зрабіў тое, што цяпер наша таварыства вырасла ў зусім паважную ўстанову. Вядома—гэта пакуль ня ўбачылі нашу кантору й цябе, старшыню і загадчыка гэтай канторы... ха-ха... Ты ведаеш, які ў нас аснаўны капітал? Сто тысяч... Маем пяць прадпрыемстваў і яшчэ тры адчыняем. Здорава? Ха-ха-ха...

— Слухай, Яроцкі, нашто гэта?

— Як нашто? Дурань ты, дурань... Слухай, барада, і разумей вялікую мудрасьць жыць-

ця... Мне трэба здаволіць свае патрэбы, мне трэба есьці, піць, браць прыгожых дзяўчат. Людзі чамусьці зрабілі так, што ўсё гэта прадаецца за грошы. Значыць—мне трэба грошы. Зразумела табе?.. Цяпер слухай, што я задумаў.

Ён паклаў руку на плячо Шчупаку, нахіліўся і пачаў гаварыць роўным і цьвёрдым голасам, спакойна ўзіраючыся ў Шчупаковы круглыя вочы. Шчупак слухаў напружна, заціяўшы дыханьне.

—Лічбы, лічбы. Грошы, шмат грошай. Столькі, што стане на дваццаць гадоў. Нашто тады гэтая служба, мадзеньне? Тады—кватэру лепшую, вопратку... хутру абавязкова, такую, як выстаўлена там, у вакне магазыну. І бялізну таксама... Пархумы... А можа... а можа... сорак гадоў... дык што там? Можна знайсьці... такую... ня зусім прыгожую, не... ня трэба... каб простая, ласкавая, каб з ёй зьвіць гнязьдзечка, каб прытуліцца адно к аднаму...

Які спрытны, які разумны гэты Яроцкі! Мабыць, сама доля паслала яго, каб падняць на ногі старога Шчупака. А колькі ў ім сілы! На яго сьмела можна пакласьціся, ён пераможа ўвесь сьвет, калі толькі захоча.

Вунь ён які. Вочы якія сталёвыя, цьвёрдыя, бровы насуплены, твар—камень. Гаво-

рыць як. Кожнае слова—загад, кожнае слова—закон.

О, які добры ў Шчупака прыяцель! За такім Шчупак пойдзе хоць на край сьвету. Абы толькі ня кінуў, абы не прагнаў. Ды не, не прагоніць. За што? Шчупак будзе слухаць яго, будзе рабіць усё, усё, што ён загадае, будзе служыць яму, як парабак, як сабака...

Яроцкі ўжо не гаворыць. Ён сьмяецца адкрыта, проста, б'е па плячы Шчупака.

— Ну як, дзед, га? Зробім так?

— Зробім, Яроцкі, зробім! Трэба хутчэй, ведаеш, каб ня выпусьціць моманту, а то яны... тож ня дурні.

— Правільна... Мы пачынаем...

Яроцкі сеў за стол, пачаў нешта шпарка пісаць. Шчупак сядзеў нярухома на ложку. Гарэла галава. У ёй ня думкі, а стрыкатыя, балючыя, як агонь, вобразы-бліскавіцы. Ня стоўпіць беднай слабой галаве напружнай навалы гэтых буяных вобразаў. Блытаецца ўсё, аж дрэнна, аж мутарна.

Яроцкі гукае к сабе. Перад ім—напісаная паперка.

— На, падпішы. Гэта трэба, ня выйдзе бяз гэтага.

— А... падпісаць. Нашто?

— Трэба. Ты-ж казаў сам, каб хутчэй пачынаць.

Суне Шчупаку ў рукі пяро. Падсувае паперку.

— Не, пачакай, прачытаць трэба. А, так... Слухай, Яроцкі, я не магу падпісаць. Гэта значыць, што я адзін за ўсё буду адказваць.

— Ты, як старшыня, павінен падпісаць гэтую ўмову. Ня я-ж буду падпісваць.

— Не магу я, Яроцкі. Гэта-ж відочны падлог, гэта жульніцтва... Дай мне падумаць хаця... (Стр. 26.

— Ты баішся?

— Баюся, Яроцкі! Ня буду хава[illegible] ся, так...

У Яроцкага ў вачох востры агон[illegible] сьціснуў, яны ледзь прыметна дрыжаць. А[illegible] тым—дабрадушна сьмяецца, па плячы Шчупака лэпае.

— Ты сьмешны, Шчупак. Няўжо ты ня пэўны ўва мне? Няўжо ты мне ня можаш паверыць? Ха-ха... Дзівак! Калі што, дык я тож ня выкручуся... На, падпішы, усё-роўна...

Шчупак падпісаў. Ён ня мог не падпісаць,—Яроцкі добра знаў гэта. Момант развагі? Гэта што-ж, можна. У яго-ж сумленьне, ха-ха... Падлог, жульніцтва...

Шчупак адышоўся, зноў сеў на ложак. Ці гэта здалося яму, ці сапраўды ўсьлед засьмяяўся Яроцкі жудасным сьмехам-сіпеньнем?

3*

Не, гэта так, шуміць галава. Вунь ён сядзіць—нярухомы, сур'ёзны, думае нешта. Гэта здалося.

О, Шчупак верыць Яроцкаму!

IX

Дзьве дзяўчыны-прыяцелькі, лежачы разам у ложку, сагрэўшыся шчыльнаю блізкасьцю цел і гарачым хвалязаньнем расчуленых сэрц, могуць правесьці ў палкай, абры-[illegible]ўчатай гутарцы цэлую ноч. Так. І гэтая ноч [illegible]ым здаецца нейкім трызьненьнем, чмутой, [illegible]памінаюць. Бо дзянное сьвятло, цьвя-[illegible]тарая бабулька, ня родзіць ужо [illegible]чырасьці, таго бяспрычыннага [illegible]а ўздыму. Уначы, толькі ўначы пла-[illegible]ь дзяўчаты, абнімаючы адна адну, цалуючы мокрымі вуснамі, і ўначы толькі сьмяюцца поўным нутром, схаваўшы твар у падушку.

Так праводзіла ноч адну Лідачка з сваёй прыяцелькай Нінай.

Ніна: статная, зграбная дзяўчына, твар даўгаваты, занадта чырвоны, вочы вадзяна-блакітныя, нос даўгаваты. Я-б сказаў—няпрыгожая. Прыгожая ў Ніны каса—даўгая, таўстая, мякка-русая. Касу Ніна заўсёды спускае і, калі гутарыць з кім, перакідае наперад.

Лідачка асталася начаваць у Ніны. Як ляглі, сперш патузаліся (каб сагрэцца), потым

абняліся туга і пачалі цалавацца. Пастанова: ня спаць цэлую ноч, а гутарыць. Усё, усё чысьценька адна аднэй расказаць.

Што Ніне расказваць? Яна зусім нічога ня ведае, у яе ў жыцьці ня было нічагутка. Яна нават яшчэ не кахала, і яе ніхто не кахаў. Во Лідачка! О, ёй ёсьць аб чым гаварыць. Хай толькі слухае Ніна, уважліва слухае, ды яшчэ прысягне хай спачатку, што ніколі нікому аж да саменькай сьмерці ня скажа ні слова.

— Ніначка, любая, ты ня ведаеш, як гэта добра. Ён мяне дужа кахае. Сапраўды. Я й сама раней думала, што... ну, упадабалася троху, думае:—Дзяўчына нішто, можна пагуляць... так сабе, жартам. Аж не, сапраўды кахае. Я ўжо ведаю, я адразу бачу. Каб ты ведала, Ніначка, як ён часамі глядзіць на мяне. У-у-у, вочы гэта чарнюшчыя, як вугаль, ды блішчаць-блішчаць... Ён часамі возьме мяне на рукі ды носіць, як дзіцяне... Далібог, Ніначка .. Сьмешна так, хм... Ён моцны, дужа моцны, у яго рукі—проста жалезныя. Сапраўды. А прыгожы які... Ты бачыла? Я таксама яго дужа кахаю... Во... во, як кахаю. Ніначка, дзетачка, мне дык заўсёды хочацца яго цалаваць. Далібог... Здаецца-б цалавала, цалавала, цалавала... усё жыцьцё, во так... во... во... Нінка, я зусім дурная, сапраўды. Гавару ня-

ма-ведама што. Але я зусім рэдка яго цалую. Ого! Няхай ён мяне, калі хоча, а я і хачу, ды ня буду. Во!..

— Лідачка! Раскажы, як ты з ім...

— Што-ж табе расказаць? Ну, мы з ім катаемся часта. Паедзем за горад, далёка-далёка, там адзін сьнег, кругом бела-бялютка. Ведаеш, гэта дужа прыемна... Пуста, нікога няма, адно поле. Ён так моцна, моцна абыме, прытуліць... І не халодна ні-ні... Раней, дык ногі мёрзьлі. А цяпер у мяне цёплыя боцікі... Ты бачыла мае боцікі? Праўда, любенькія? Ну, вось... А потым заедзем куды ў рэсторан. Вячэраем, п'ём віно, шампанскае... У яго, ведаеш, дужа многа грошай. Ён багаты...

— Лідачка, родненькая... я далі-бог нікому не скажу... скажы, ці ты... аддалася?..

Лідачка хавае саромліва твар у падушку. Гаворыць глуха, ледзь чутна:

— Ага!

І раптам хапае Ніну, абымае парыўчата.

— Нікому ня скажаш?

— Што ты! Нікому ў жыцьці. Толькі, Лідачка, ты раскажы... раскажы, даражэнькая...

Лідачка прыхіляе вусны да самага вуха і шэпча. Потым часінку моўчкі ляжаць, думаюць кожнае сваё. Ніна нясьмела пытаецца:

— Ці ён з табою ажэніцца?

— Ня ведаю. Ды мне ўсё роўна. Цяпер не глядзяць на гэта. Гэта раней, дык каб абавязкова выскачыць замуж. А цяпер—інакш. Ты яшчэ ня ведаеш, я табе зараз скажу. Цяпер галоўнае, гэта—пажыць. Так пажыць, каб было чым успомніць. Ніначка, ну што за карысьць, калі я выйду замуж? Што тут прыгожага? А так—весела, радасна, добра. Жывеш і не прымячаеш, як цягнецца час. А каханьне... гэта-ж такое шчасьце, такая ўцеха, каб ты ведала толькі. Ну, калі іншая няпрыгожая, брыдкая, дык хто на яе і паглядзіць. Такая ўжо доля яе нешчасьлівая. Яна й век пражыве, а не пазнае, што значыць—кахаць... Ніначка, дзетачка, што ты? Ты плачаш? Чаго? Кінь, сапраўды... Ты таксама можаш знайсьці, хто цябе пакахае, далібог. Думаеш, ты зусім няпрыгожая? Што ты! І ня гэткіх кахаюць. Ну, кінь, дзетка, ня плач, а то й я зараз зарумзаю... Знаеш што, Ніначка? Я цябе пазнаёмлю з таварышом Яроцкага. Праўда, ён паджылы, але нішто яшчэ... Ты яму загадай, каб ён згаліў бараду, дык зусім будзе прыгожы. Мы тады разам будзем гуляць, будзем катацца, куціць, у тэатры хадзіць. Ну кінь, Ніначка, ня плач... Як табе ня сорамна... Кінь, а то і я... зараз... таксама... зап...ла...чу...

Уначы, толькі ўначы плачуць звычайна дзяўчаты-прыяцелькі, абнімаючы адна адну, цалуючы мокрымі вуснамі.

X

Назаўтра ўвечары Шчупак сядзеў у Лідачкі. Адчуваў сябе так, як аматар-актср, што першы раз вышаў на сцэну. Дзіва! Ці думаў ён калі, што ім зацікавіцца маладая дзяўчына! Самая сапраўдная прыгожая дзяўчына!

Яна прыгожая. Вядома, не такая, як Лідачка, бо такіх і наогул няма больш нідзе. Але і ў яе вочы блакітныя, чыстыя, і ў яе вусны, як журавіны. А косы, дык лепш, як у Лідачкі.

Шчупак не глядзіць на яе, неяк страшна. Толькі так спадкрадня, няўпрыметку, каб і яна і ніхто не заўважыў. І гаварыць з ёй ня важыцца. З Лідачкай, дык, з гэтай нішто—складна, прыемна выходзіць. А з ёй? Аб чым з ёй гутарыць трэба?

Яроцкі шкеліць, пад'юджвае:

— Шчупак! Ты, як ішоў з канторы, не праглынуў тую лінейку, што вісела на сьцяне ля акна?

Шчупак наіўна:

— Не.

— Дзіўна. Чаго-ж ты сядзіш так проста, як кол?

Усе рагочуць. Шчупак сарамліва гарбаціцца.

— Чорт гэты Яроцкі. Што ён выгадвае?

А Яроцкі зноў:

— Шчупак! Да цябе ня прыходзіў сёньня адзін трубачыст?

— Трубачыст? А што яму трэба?

— Ды ён пытаўся, ці не прадасі ты сваю бараду, памяло яму трэба зрабіць.

Зноў рогат. Шчупак чырванее. Рука міжвольна цягнецца к барадзе. Рогат мацнейшы. Шчупак ня ведае, што рабіць, і лае ў думках Яроцкага.

Горш за ўсё, калі ў вушшу прасакочыць рассыпчаста-звонкі сьмех Ніны. Тады не сядзіцца на месцы, хочацца нешта зрабіць, паказаць, што не такі ён зусім, як яны думаюць, што й ён умее сказаць, жарт спрытны выкінуць.

Перад тым, як разыходзіцца, усе вышлі на вуліцу. На дварэ цёпла, адліга. Яроцкі папрабаваў, ці добра комчыцца сьнег і шыбнуў у Лідачку. Тая назад. Пачалі ў сьнежкі гуляць, абудзілі жывой сумятнёй цішу соннае вуліцы.

Шчупак гуляў вельмі нязграбна, і таму напасьледак усе на яго аднаго наваліліся, засыпалі сьнегам чыста-ўсяго. Ён і не адбіваўся. Хай, усё роўна. Прапала ўсё. Калі й была

у Ніны якая цікавасьць, дык ужо й сьледу не асталося. Хутчэй-бы толькі да хаты.

Пачалі разьвітвацца. Ніна папрасіла праводзіць яе і Шчупаку выпала йсьці.

Доўга маўчалі, Шчупак як ні тужыўся, нічога прыдумаць ня мог, каб сказаць, каб пачаць гутарку. Урэшце ён успомніў, што першна-перш трэба пад пашку ўзяць—пачынаюць звычайна з гэтага. Ён набраў для храбрасьці поўныя грудзі паветра і сказаў, надзвычайна ласкавым тонам:

— Можна вас?..

Яна нібы ў задзіўленьні на момант к яму абярнулася.

— Калі ласка.

Ён узяў яе за руку так асьцярожна і квола, як звычайна бяруць гадзіньнік, каб паглядзець на расчынены мэханізм.

— Як вам падабаецца сёньня пагода?

— Нішто, добрая. Цёплая, можна хаця прайсьці, пагуляць. А то цалюткі дзень сядзіш, працуеш...

— Вы многа працуеце?

— Я вучуся і, апрача таго, бяру розную работу, каб зарабіць што на пражытак. Але я люблю працаваць, мне няцяжка.

— А я дык зусім ня люблю. Мне дужа надакучыла працаваць.. Я, можа, і зусім кіну...

— Як гэта? А жыць вы з чаго будзеце?

Шчупаку дужа хочацца ўсё расказаць, усе свае патаемныя думкі-мары, што разрасьліся пышнай руньню з насеньня, кінутага шчасьлівай рукой Яроцкага. Гэтай дзяўчыне ён усё-б расказаў, бо зусім яна простая і ласкавая. Але не, няможна. Хто яе ведае. Лепш пра яе распытаць.

— Скажэце, Ніна, вы адна жывяцё ці ў сям'і?

— Адна. Сям'я мая на вёсцы, я ўжо год нікога ня бачыла. Ёсьць тут знаёмыя, я да іх адразу прыехала. Потым паступіла вучыцца, стала шукаць работы.

Яна разгаварылася і жвава, з дзявоцкай пасьпешнасьцю і бяссыстэмнасьцю расказала яму ўсё жыцьцё сваё. Потым ён пачаў расказваць. Нічога не хаваў, гаварыў аб усім, што было ў яго несамавітым жыцьці. Дый як не сказаць аб усім, калі яна так уважліва слухае, так спагадае яму? Ці быў хоць раз у жыцьці ў яго гэткі выпадак, каб староньні, чужы чалавек так чула, так мякка прыслухаўся да яго шчырых прызнаньняў?

Ён і сам урэшце расчуліўся, самому стала шкода сябе.

Ну, што ў яго было сьветлага, добрага? Хто хоць раз сагрэў яго адзінотнае сэрца? Шэрасьць, мадзеньне, вечны смутак, нудота.

Балюча расчулены сваімі расказамі, сваімі глыбока журботнымі думкамі, сьціх Шчупак. І была ў сэрцы растопленым боль шчымлівая і шчымлівая радасьць. Соладка і добра было.

У сінява-чорнай начы рассыпаўся сьвінцом шопат кропляў, што густа сьцякалі са стрэх. Было ў гэтым шопаце нешта чужое, настойнае, як у сьлюнява-злосным маленьні старцакалекі. І мокрая няпрытульнасьць гэтага шопату прыціскала Шчупака да Ніны, напінала салодка-цёплыя струны блізкасьці.

Што думала Ніна? Што адчувала?—Хто яе ведае! Можа ў зморку мігцела ёй плямай балючай барада Шчупака? Мо' ўспаміналіся шчырыя словы расчуленай Лідачкі— „ты яму загадай, каб зголіў бараду—зусім будзе прыгожы“?

Маўчала. Ішла. Але, падыходзячы к дому, замарудзіла крокі, ласкавей прыціснула Шчупакову руку. На разьвітаньне сказала працяжліва, глуха:

— Заходзьце ка мне калі-небудзь...

І каб падкрэсьліць значнасьць гэтых слоў, ураз павярнулася й зьнікла.

У паўночнай сьлюнявай шэрасьці Шчупак рэзка адчуў сваё адзіноцтва.

Быццам ураз вакол яго вырасла халодным правалам чорная пустач.

Але закапала нешта на сэрца—нешта агнёвае і цягуча-салодкае, усьпеніла сэрца напорным уздымам.

У волкай цемры, у сьвінцовай хлюпоце занырала пасьпешна, нэрвова яго карабатая постаць.

Эх, Шчупак, Шчупак! Чаго ён так разагнаўся па сьлізкай дарозе? Чаго ён рукамі махае шырока так, чаго галаву так утупіў? Ці помніць ён, што йдзе да хаты, што там халодна, на падлозе анучкі трэба сушыць (8 штук усяго), што заўтра кантора—сухая, шэрая, што Яроцкі робіць страшную злачынную справу—яго робіць злодзеем, жулікам?..

Ці ня ўзбуяла сэрца старое? Ці ня ружовы тлум у старой галаве?

Эх, Шчупак, Шчупак!..

XI

Радасна-ціхае сонца сыпецца бледным праменьнем скрозь іскрыстыя шыбы і цёпла сьцелецца па падлозе—рэдка й зыбуча. Празрыстасьць ціхая ў сонцы, празрыстасьць і ў шыбах іскрыстых і там, за акном, у белі бліскучай.

Калі сонца так мірна й спакойна цалуе падлогу, і калі ў ката, што выгінаецца млява на цеплаватых квадратах, празрыста сьвіцца ўзьбітая шэрсьць (зіма, мароз на дварэ),

тады й на душы ціхая празрыстасьць, спакойная ласка. Лідачка ў такія часіны сьпявае ціхую песьню („Зорка-Вэнэра“), Лідачка кідае кніжку і поркаецца ў старых пажоўклых паперах. Там лісты—радасьць і сьмех маладосьці—празрыстыя, ружовыя ўспамінкі.

Цяпер Лідачка тож сьпявае ціхую песьню і шые сабе новую сукенку.

Як гэта радасна—шыць новую прыгожую сукенку, у якой потым убачыць любы! Ён убачыць і ўсміхнецца—ласкавы, сьветлы,—залюбуецца. Здасца яму больш сьвежым яе хараство, больш яскравым, гарачэй будзе ён цалаваць. А яна—шчасьлівая—прытуліцца да яго, абаўе яго ласкай бязьмернай, будзе ўзірацца бясконца ў шаўковыя вочы яго, будзе гарэць чароўнай пяшчотай, адданасьцю.

— На, любы, бяры, калі хочаш, і мяне і гэту новую, прыгожую сукенку!..

Сёньня сьвята. Таму за сьцяной чуваць крокі Горскага. Ён дома і, як заўсёды,—працуе. А мо' думае толькі? Мо' аб ёй думае? Ці думае ён калі аб ёй?

Пэўна думае. Ён цяпер ніколі з ёй не гаворыць, ён сярдзіты такі ўвесь час, маўклівы, як воўк. Ён злуецца на яе, а значыць—думае аб ёй. Так.

А Лідачка на яго ня злуецца. За што? Што ён ня знае, не разумее шчасьця яе? Ку-

ды яму! Ён такі сур'ёзны, сталы, ён і гаварыць ня ўмее зусім пра каханьне. Ён ня любіць, калі яму дакучаюць, заняты заўсёды, гаворыць толькі аб сур'ёзным.

А Лідачка дык раней любіла дражніць яго. Яна часта хадзіла ў яго каморку і перашкаджала яму працаваць. Ён тады выганяў яе. Аднаго разу ён проста й сур'ёзна, бяз ніякае ўсьмешкі, узяў яе на рукі, вынес з пакою і прынёс да маткі.

— Наце вашу дачку і ня пускайце яе ў мой пакой, бо яна мне перашкаджае.

І пашоў моўчкі назад. Сьмешны! Доўганосы!..

Цяпер—дык Лідачка ніколі ня ходзіць да яго. Неяк страшна, дзіка. Каб ён цяпер выгнаў яе... мажа-б, яна і заплакала нават...

Роілам скомчылася на каленях шціва. Рукі млява акунуліся ў хвалі матэрыі. У вачох— задуменнасьць празрыстая. Казытае сэрца лёгкі павеў успамінаў нядаўных, сее пялёсткі мяккай пяшчоты.

Ні то сум, ні то радасьць.

Віктар, Віктар...

— Лідачка!

Гэта глухі, здушаны сьцяной голас Горскага.

— Што?

— Зайдзецеся да мяне на хвілінку, пагутарым.

Да яго? Гутарыць? Не, гэта ня проста так, ён нешта хоча сказаць.

Як уваходзіла, білася сэрца. Ад цікавасьці і ад трывогі. Увашла ціхая і сур'ёзная, мякка падняла на яго марудныя вочы, налітыя ціхім чаканьнем.

— Што скажа?

Ён ходзіць узад і ўперад, цьвёрда, важка становіць нагу, быццам падкрэсьлівае правільнасьць думкі свае. На твары звычайная ўглыбленасьць, сур'ёзнасьць. Прыгожы ён ці няпрыгожы? Нос усё-ткі даўгі. Брыдкі нос.

Сеў. Ага, і ў яго можа твар пакрывіцца ад абурэньня схаванага, і ў яго ў вачох мятушэньне? І нага вунь як дрыжыць у калені. Хвалюецца ён.

Горскі пачаў гаварыць сьціснутым, быццам скрозь зубы, голасам:

— Мне, Лідачка, дужа трудна гаварыць з вамі аб тым, аб чым я хачу і аб чым трэба з вамі пагутарыць. Я баюся, што вы растлумачыце йначай мае словы, дасьцё ім няправільны сэнс і, самае галоўнае, знойдзеце ім такую прычыну, якая, бязумоўна, будзе абразнай для мяне.

— Я вас не разумею.

Голас Горскага сьцьвярдзеў, стаў сухім, аднатонным.

— Я буду гаварыць аб Яроцкім, і вы можаце падумаць, што я раблю гэта з зайздрасьці.

Чамусьці Лідачцы сорамна стала. Нядобра так, прыкра. Чула, як набягае на твар хваля чырвані. А Горскі далей гаварыў-адсякаў цяжкія дзіўныя словы. Кожнае слова—удар па ўзрушаным сэрцы. Сухі ўдар і востры.

— Так. Я вас люблю. Гэта—бадай што не каханьне, такое, як разумеюць звычайна. Я люблю вас, як дзіця, можа прывык толькі, я сам у гэтым добра не разьбіраюся. Ну, вось... Пачынаю з прызнаньня. Гэта сьмешна, так?.. Я гавару гэта затым, каб яшчэ больш было яснасьці ў нас... Вы верыце мне, што я ня маю ніякай асаблівай мэты, што хачу гаварыць з вамі проста па дружбе?

Лідачка маўчала, утупіўшыся.

— Верыце ці не?

— Я, т. Горскі, заўсёды вас паважала. Чаму вы пытаецеся?

— Добра. Цяпер да справы. Я бачу, што вы кахаеце Яроцкага, што вы захапіліся ім. Гэта дармо, гэта справа пачуцьця, як кажуць, справа сэрца. Я хачу толькі адкрыць вам вочы на тое, што выяўляе сабой гэты Яроцкі. Вы яго ня знаеце, лічыце не за таго, хто ён ёсьць, і, мне здаецца, гэта прычына вашага захап-

леньня. Вам трэба схамянуцца, Лідачка, бо вы на дарозе да згубы.

Горскі змоўк на хвілінку. Лідачка суха шапнула белымі вуснамі:

— Кажэце далей.

Думала:

Хай гаворыць усё да канца. Ей баліць, у яе сэрца гатова разарвацца, у яе горла даўкім комам сьціскаецца. Але хай сабе, хай гаворыць. Ён жа ня бачыць мукі яе, яму не баліць... Толькі чаму так суха ён, неспагадна? Чаму сярдзіта так, быццам сварыцца?..

— Вас захапіў яго бляск, вас інтрыгуе яго нязвычайнасьць, орыгінальнасьць. Гэта—надворнае ўсё, гэта—штукарства, ігра артыстычная. О, ён куды прасьцейшы, ён зусім просты, звычайны. Такіх, на жаль, яшчэ нямала ёсьць. Іх усюды можна сустрэць, толькі ў вопратках розных. Грамадзтва з імі змагаецца, бо яны яго ворагі, яны сваім зьвярыным індывідуалізмам падрываюць колектыўную злучнасьць грамадзтва, дапамагаюць разьвіцьцю анты-грамадзкіх інстынктаў. Гэта дэфэктыўныя выродкі чалавецтва, гэта—законны плод буржуазнага ладу, гэта яго спадчына нам, падарунак.

Лідачка слухала моўчкі, утупіўшы вочы. У ваччу—Віктар, шаўковыя, чорныя вочы. Ён —вырадак? З ім змагаюцца? Хто? За што? Ка-

му ён зрабіў што нядобрае? Дзіўна Горскі гаворыць, не зразумець яго... Лідачка чакала нечага іншага. Страшнейшага чакала. Цяпер ёй нават лягчэй, цяпер яна гатова й спрачацца. Ну што-ж там такога? Віктар таксама казаў, што ён адзін, што не прызнае грамадзтва. Ён так прыгожа казаў, ён захапляў сваёй сьмеласьцю, сваёй прыгожай рызыкай.

І Лідачка пасьмялела. Яна ўжо з усьмешкай — з хітраватай гарэзьлівай усьмешкай глядзела на Горскага, на яго нос, так сьмешна нацягнуты важнай сур'ёзнасьцю. Хацелася самой гаварыць, зьдзівіць Горскага нечаканай заявай.

— Т. Горскі! Я шчыра дзякую вас за тлумачэньні, але для мяне гэта не навіна. Я шмат гаварыла з Яроцкім і знаю яго погляды на жыцьцё. Памойму, нічога тут няма страшнага. Я блізка што згодна з ім. Чалавек—эгоісты па сваёй уродзе, і ён такім павінен быць.

Лідачка наўмысьля падкрэсьліла апошнія словы і дэманстратыўна, задорна зірнула на Горскага. Горскі ўстаў, пахадзіў па пакою. Спыніўся і паглядзеў на яе вострым лядзяным поглядам.

— Вашы словы для мяне тож не навіна. Я іх чакаў, яны падкрэсьліваюць правільнасьць маіх думак. Ха-ха! Значыць, вам падабаюцца гэткія людзі, вы гатовы далучыцца да іх по-

глядаў на жыцьцё? Вось у гэтым якраз і памылка ваша, ад якой мне хацелася вас перасьцярэгчы. Лідачка, мне не хацелася-б гаварыць груба і жорстка, вы мяне выбачце... Вы ведаеце, як завецца на мове грамадзкае думкі Яроцкі? Ведаеце, хто ён такі?

Горскі спыніўся. Гэта наўмысьля ён так, каб мацней уцяць Лідачку. О, Лідачка гэта разумее. Але—няхай, яна вытрымае. Яна здолее выслухаць да канца яго сухія жорсткія. словы.

— Яроцкі—жулік. Так. Самы звычайны. Ён—злодзей, які толькі дзіўным выпадкам не сядзіць у турме. Вы гэта ведалі?

Кожнае слова з сьвінцовым націскам. Кожнае слова—удар. Быццам—кат, быццам наўмысьля хоча мучыць, ірваць азьнібелае сэрца.

Але—як ён сьмее? Хто даў яму права так гаварыць? Хто дазволіў яму абражаць яе любага, таго, хто так многа ёй даў, праз каго яна так глыбока, так моцна шчасьце пазнала?..

Віктар! Любы Віктар! Каб быў ён тут, каб чуў сам гэту абразу, сам сябе абараніў! Бо яна-ж зусім слабая, яна ня здолее быць яго абаронцам.

А як-жа тукае сэрца, як кіпіць унутры, як хочацца кінуцца зьверам на іх, на ўвесь сьвет, на ўсіх, хто супроць яе мілага, хто так абражае яго.

— Гэта няпраўда. Вы ілжыцё! Вы наўмысьля хочаце яго ачарніць. Гэта... гэта... нядобра рабіць так.

Горскі стаіць перад ёй, моўчкі ўсьміхаецца. Усьмешка гэта нутро ледзяніць, цяжкая яна, як гнёт стопудовы.

— Гэта лёгка давесьці. Ён атрымлівае сорак рублёў у месяц. Значыць, усе гэтыя гулянкі, увесь гэты бляск ён дасягае зладзействам. Ён—казнакрад. Гэта першае...

Не, досыць ужо. Яна нічога ня хоча больш слухаць, яна больш ня вытрымае. Яна ня верыць, ня верыць... Гэта—наўмысьля, гэта па злосьці... Якія нядобрыя ўсе! Што ім трэба ад яе, каму яна перашкаджае? Нашто так мучыць, так зьдзеквацца?

Горскі сядае з ёй поплеч. Ён пытаецца ўжо зусім іншым—мяккім, пяшчотным голасам:

— Чаго вы плачаце, Лідачка?

Яна плача? Яна й сама не заўважыла. Трэба стрымацца, ня трэба паказваць яму свайго пачуцьця.

— У мяне... баліць... галава... Я пайду лягу...

У хаце нікога няма. Як добра можна паплакаць, аддацца нястрымана свайму пачуцьцю, свайму гору! Легчы на ложак, уткнуцца тварам у падушку і плакаць, плакаць.

Скрозь празрыстыя шыбы сыпецца мякка-празрыстые сонца, сьцелецца па падлозе дрыготнымі жоўтымі плямамі. Ад сонца ў ката празрыстая шэрсьць, і таксама празрыста сьвіціцца золатам каса Лідачкі, што недалужна зьвісла з ложка.

Кот шаўкова курлыкае і гуляе з Лідачкінай касой.

XI

Вось успамінак мой, аўтара. Ён нам прыдасца, як вобраз для ўразуменьня настрою Яроцкага.

Гэта з дзяцінства яшчэ. Тады і ў маіх вачох быў чысты блакіт, тады й мае валасы так віліся, як белыя хмаркі на сонечным небе.

Так мне казалі. А помню я во што...

> Ясны летні паўдзён. Здаецца, што сонца зусім спусьцілася на зямлю і расплылося—густое, пякучае, абліло ўсё чыста варам квяцістым. Усё застыгла, быццам самлела, быццам аддалося ў душных абнімках палкага сонца пераліўчаста-цягучай млосьці.
>
> Сад разьлівае салодкі густы аромат. Аромат гэты звонкі, жывы, бо ў ім распусьцілася і напорна-траскучае верашчаньне скачкоў, і блакітны званочак песьні жаўронкавай, і масьляністы клёкат сялянскіх вазоў там недзе, на вёсцы.

Помню, што я ў той паўдзён прыслухаўся першы раз да ўрачыстасьці прыроды. Кажу „прыслухаўся“, бо няма-ж таго слова, якім можна выказаць стан дзіцяці, калі яно ўсё раскрываецца, як пялёсткі нейкай казачнай кветкі, каб уліць, увабраць у сябе песьню жыцьця, каб злавіць сваёй чуласьцю кожны пераліў урачыстай гармоніі.

Я стаяў зачарованы. Мне здавалася, што і ўсё навакол зачарована, што таму й самлела ўсё чыста, што й сам я зараз самлею.

І ў гэты момант я пачуў над сабой звонкі імпэтны гуд. Я ня знаў, дзе ён, адкуль, ці гэта пчолы, ці так што—я не разважаў. Адно чуў, што гуд гэты ня зьліваецца з тэй агульнай, дзівоснай гармоніяй, што ён рэжа яе, дзіка праз яе прадзіраецца.

Мне стала страшна. Я з жахам прыслухоўваўся, як расьце гэты гуд, як набліжаецца. Я хацеў уцячы і ня мог, бо ня знаў, куды ўцякаць, у які бок. Я стаяў і чакаў. Я гатоў быў кожную хвіліну закрычаць, падняць дзікі шалёны гвалт, зваць на ратунак.

А гуд усё рос, усё гусьцеў і шырэў. Здавалася, ён паступова ўпарта акружае

мяне, што насуваецца ён разам з ўсіх бакоў—магутны і злосны, бязьлітасны Яшчэ момант—і спасьцігне, абаўе, увап'ецца ў цела болем страшэнным.

Урэшце я ня стрымаў. Я кінуўся ніц у траву і заплакаў. Плачам я хацеў заглушыць гэты гуд, але ён настойна ўрываўся ў вушы і паліў нутро агнёвым спалохам. Я біўся ў траве падстрэленай птушкай, я плакаў, крычаў, ахоплены жудасьцю.

Потым мяне падняла маці і заспакоіла. Якраз над маёй галавой на яблыні зьвіўся пчаліны рой.

Мяне тады ня ўкусіла ніводная пчолка. Гэта можа затым, што тады ў вачох маіх быў чысты блакіт, а валасы так віліся, як белыя хмаркі на сонечным небе?

Пасьля мне сьмешна было. І цяпер сьмешна. А расказаў я гэта толькі затым, каб даць вобраз настрою Яроцкага...

Быў адзін дзень, калі Яроцкі ў гарачай жыцьцёвай сумятні, у пярэста-кіпучай штодзённшчыне раптам пачуў небясьпеку. Ён ня знаў, дзе яна, адкуль насуваецца, але чуў яе ясна, выразна, як гудзеньне звонкае пчол у

душны паўдзён. Ён нутром пачуў небясьпеку.

Чарвяком едкім, назольлівым зьвіўся страх у грудзёх. Зразумеў Яроцкі, што трэба канчаць тут, трэба сябе ратаваць.

Але з чаго пачынаць? Адкуль чакаць небясьпекі? Гудзіць яна недзе, навісла над галавой гнётам злосным, уедлівым, пагражае невядомай, грознай навалай.

Яроцкі рэдка ў канторы стыкаецца. Вечарамі—квяціста-атрутны бляск жыцьця гульліва-распуснага. А ўдзень ён ходзіць па шумлівых вуліцах гораду, слухае, прыслухоўваецца да напружна-жывога, цьвярозага, гарадзкога жыцьця. Яно—чужое яму, нялюбае, нуднае. У ім няма чаду, яно яснае, белае. Горад удзень—не Яроцкага.

Удзень вуліцы гораду перасыпаны звонкай пасьпешнасьцю. Ідуць, перабягаюць, сьпяшаюцца—маладыя, старыя, важныя, простыя, з портфэлямі, без портфэляў, з вусамі, з бародамі, бяз вусоў і барод. На хаду зьвіваюцца гутаркі—сьціслыя, пасьпешнасьцю разарваныя.

Удзень у людзей розныя твары, кожны твар—сам па сабе, бо дзень ня любіць хварбы густой, што пляшывіць твары яркасьцю мёртвай. Удзень хварбы толькі купляюцца.

Яшчэ—удзень у горадзе кажуховымі плямамі уплятаюцца дужыя сьпіны. Гэта—вёска.

Вёска: жніўныя песьні, як ядраны звон вячэрняй зары, масьляністы клёкат сялянскіх вазоў.

Горад: сталёвыя ўзмахі машын, імпэтна-разгонны лёт празрыстага паса.

І яшчэ горад—сынтэз жніўных песень і сталёвых узмахаў.

Горад удзень—не Яроцкага. Ён нудны яму, бо няма чаду. Ён чужы і далёкі яму. Мо' затым і чарвяк гэты ўедлівы зьвіўся ў грудзёх? Мо' таму й гудзіць гудам трывожным небясьпека няясная? Дзе яна? Адкуль набліжаецца?

Надвячоркам неяк Яроцкі сустрэў у горадзе Лідачку. Яна парыўчата схапіла яго за руку. У яе блакітных вачох дрыжэла цяжкае непаразуменьне. Боль, вострая мука гарэла ў вачох.

Яроцкі чакаў запытаньня. Яна зьвярнула ў бязьлюдную вуліцу.

— Віктар, скажы мне... Гэта-ж няпраўда? Гэта налгалі мне, так?

— Я нічога ня ведаю.

— Віктар! Знаеш, што мне казалі? Мне казалі, што ты... што ты толькі сорак рублёў у месяц атрымліваеш... што ты... дастаеш грошы...

— Ха-ха-ха! Вось ты аб чым? Магу цябе заспакоіць, усё гэта няпраўда. Я атрымліваю сорак рублёў, але штомесяц мне прысылае брат, ён служыць у Маскве... А ты ўжо й паверыла?..

— Не-не... Я не паверыла... Я так мучылася... Як мне добра цяпер... Любы ты мой, дарагі... Ну, ці моцна люблю я цябе, га? Як ты думаеш?

Яна весела лапатала, радасна тулілася да яго, як дзіця да роднае маткі. Блакітныя вочы гарэлі ўжо шчасьцем, здаволеньнем.

— Віктар! Пойдзем зараз да нас... Ну, пойдзем, зрабі гэта для мяне... Я дужа хачу, каб ты прышоў... Я пакажу гэтаму доўганосаму!..

Яроцкі паморшчыўся: ня хочацца йсьці. Але не пайсьці, дык патраціць веру ў яго. Яшчэ рана... На апошнія дні яна трэба, бо трэба хмель, трэба чад.

Марудна цягнуўся Яроцкаму гэты вечар. У пакой, ранєй такі ласкавы, ветлы, цяпер халоднай шчылінай няпрытульнасьць уелася. Матка зацята маўчала, сярдзіта схіліўшыся над швівам. Раз-по-разу ўздыхала—густа, дэманстратыўна. Знае нешта й яна. Нават малы, і той ня дурэе: стуліўся з катом на канапе, ня лезе к Яроцкаму.

Толькі Лідачка—вясёлая, жвавая—зьвініць бязрупатным сьмехам, дурэе, гарэзуе, як і раней. Яна не зважае на матчын настрой, бо добра ведае, чаму матка так сярдзіта схілілася над швівам. Сьмешная мамка. Яна-ж ня ведае, што гэта няпраўда, што Віктар бязьвінны, зусім бязьвінны. Глупства. Як пойдзе Яроцкі, Лідачка ў момант разгладзіць маршчынкі на мамкіным твары. І добра пасьмяюцца тады яны разам.

Нядобра толькі Лідачцы стала, як у пакой увашоў Горскі. Пачулася вострая напятасьць, напружанасьць. Быццам унёс з сабой Горскі халоднасьць нейкую—сухую, жорсткую, якая прыкра ўсіх шкрабанула, абудзіла ўва ўсіх настарожанасьць.

Горскі прывітаўся з Яроцкім, але рукі не падаў. Лідачка ўбачыла, як нэрвова трасуцца яго вялікія рукі. Яшчэ ўбачыла ў Яроцкага ў чорных глыбокіх вачох зеленаваты агоньчык. Скаланула сэрца трывога. Чула, што нешта будзе—страшное, нядобрае.

Горскі першы пачаў.

— Вы яшчэ не паехалі?

— Як бачыце. Яшчэ тут марынуюся.

— Ну, як вашы посьпехі?

— О, шчасьце заўсёды са мной. Яно мяне любіць, бо і я таксама люблю яго і ўмею яго даставаць.

— Так. Гэта ня кожнаму ўдаецца. Каб лёгка даставаць тое, што вы завіцё шчасьцем, трэба мець асаблівую спрытнасьць.

— Ха-ха! Гэта правільна. І галоўнае—розум патрэбен. І сіла таксама, каб перш за ўсё звольніць сябе ад тых забабон, якімі аплецен цяпер чалавек, якія для дурняў зьяўляюцца непарушнымі законамі...

— Задушыць грамадзкія пачуцьці, што тысячагодзьдзямі ўзгадаваліся ў організьме чалавека, скінуць культуру і стаць голым зьверам, які перагрызае горла такому-ж, як ён, каб адабраць кавалак сьвежага крывавага мяса.

— Яшчэ раз правільна. Прыгожасьць жыцьця ў натуральнасьці. Чалавек—зьвер. Моцны перамагае слабога, моцны бярэ ў жыцьці лепшы кавалак.

Яроцкі гаворыць з тонкай усьмешкай. У вачох, востра прыжмураных, жвава мільгаюць агоньчыкі. Горскага твар нярухомы, застыглы. Калі ён гаворыць, здаецца, што робіць фізычную справу; здаецца, што словы яго маюць пэўную форму, што гэта ня словы зусім, а фігуркі жалезныя, цьвёрдыя.

Горскі стаў хадзіць па пакою. Яроцкі вадзіў за ім сваю тонкую ўсьмешку.

Раптам Горскі крута спыніўся. І ў яго нібы ўсьмешка па вуснах прабегла—крывая

толькі, жорсткая. І ў яго вочы прыжмурыліся, блiснулі едкай пагардай.

— Слухайце, грамадзянін Яроцкі. Я хачу шчыра з вамі пагутарыць. Нашто гэтыя гучныя фразы, нашто гэта дутае геройства? Я-ж вельмі добра ведаю, хто вы такі...

Яроцкі міжвольна стуліўся, сабраўся ўвесь у камок, як зьвер, што пачуў небясьпеку.

— Аб чым вы хочаце гутарыць?

— Нават ня гутарыць... проста, мне хочацца маску садраць з вашага твару. Я вам проста скажу, памужыцку. Нашто разводзіць філёзофію, калі вы самы звычайны прахвост.

Яроцкі ўскочыў. Увесь закіпеў, затросься.

— Што вы сказалі? Гэта абраза!

— Не абражайцеся. Вы маеце досыць розуму й сілы, каб вызваліць сябе ад забабон. Абраза—гэта-ж адны забабоны.

Лідачка памкнулася нешта сказаць. Яе спыніла матка. Старая дрыжэла ад гневу, доўга бязгучна шавяліла старчымі вуснамі, покуль моцы сабрала сказаць:

— І я... вам скажу... Віктар Андрэевіч... ідзеце вы ад нас... і ня прыходзьце больш... Я не хачу, каб вы маю Лідачку зводзілі...

Яроцкі азірнуўся, каб убачыць Лідачку. Яе ня было. Яна плакала ўжо ў суседнім пакоі.

Яроцкі моўчкі завярнуўся й выбег з хаты.

Абмывала чорнаю зольлю маўклівая ноч. Ноч на бязьлюднай акрайне гораду. Ноч гуcтая, як дзёгаць, пільна настарожаная, як вораг. Здаецца, сочыць заўгольлем глухім, падцікаецца, гатова схапіць у свае капцюры—мяккія, вязкія, але сьмяротныя.

У гэтай начы Яроцкаму—гуд небясьпекі. Гэтая ноч на сэрца ўзьлягаецца страхам зьвярыным, цяжкім. Будзе, ой, будзе бяда!

Яроцкі пасьпешнымі лёгкімі крокамі прабіраецца праз глухія завулкі. У целе ўва ўсім—напятасьць, спружынавасьць нейкая. Пальцы сударгава ў кулакі кручацца. Бо чуе, інстынктам зьвярыным чуе, што блізка вораг, што моцны ён, страшны, што з ім бойка—на сьмерць.

А на твары застыгла грымасай усьмешка. Усьмешка гэта такая, што ў ёй разам пераплялося: і гэты дзікі незразумелы спалох, і сьлюнява-недалужная злосьць (Горскі з галавы ня выходзіць), і злорадаснасьць дзікая. (Ха-ха! Дачку беражэ, дура старая!).

Толькі, як загарэліся, заблішчэлі морам агнёў, загудзелі сумятнёй хваравітай вуліцы шумнага цэнтру, Яроцкі стаў сам сабой, пашоў спакойным, разьмераным крокам. Тут менш страху, тут гуд небясьпекі трацiць напружнасьць сваю, заглушаецца чадам пярэстым вячэрняга гораду.

Але пашоў дахаты. Хочацца схавацца сягоньня, хочацца быць аднаму. Думаць, думаць, шукаць, знайсьці, што-б ні было, а знайсьці ратунак, выйсьцё.

XIII

Нехта ціха паляпаў у дзьверы. Яроцкі нехаця падняўся з ложка, адамкнуў дзьверы. Сярдзіта спытаўся:

— Што трэба?

І здрыгануўся ад нечаканасьці. Лідачка. Чаму яна тут? Пасьля таго, што там адбылося, пасьля зьнявагі, пагарды?

Лідачка парывіста кінулася да яго, сударгава схапіла за рукі.

— Віктар, даражэнькі... Ты даруй мне, гэта я вінавата. Я павяла цябе туды, я ня знала, што так можа быць. Віктар, любы... Мне бальней яшчэ, як табе. Я іх усіх зьненавідзела, я больш не магу... Ты даражэй мне... ты мой родны, блізкі...

Яна прытулілася да яго, плакала ў яго на грудзёх. Яроцкі яе адпіхнуў, засьмяяўся сухім, драўляным сьмехам.

— Ха-ха-ха... Як ты многа гаворыш аб сваім каханьні. Якія прыгожыя словы, ха-ха!.. А тымчасам—ілжэш ты, ня веру я табе. Ты думаеш, у сьлёзах гэтых, у гэтым сьлюма-

чаньні пачуцьцё выяўляецца? Ха-ха, гэта вельмі кісла, ведаеш, і няцікава.

Лідачка адступіла, працятая непаразуменьнем.

— Віктар, што ты гаворыш? Што табе трэба яшчэ?

— Мне зусім нічога ня трэба. Я ня прывык прасіць. Я хачу толькі, каб ты сама сазналася ў тым, што ўсе твае словы—толькі словы і зусім пустыя... Вось слухай... Усё тое, што ты чула пра мяне, усё тое, што казаў гэты Горскі, усё гэта—праўда. Так, так. Больш таго. Яны мо' сотую частку ведаюць толькі. Я—злачынец, я—прахвост, я—чалавек, які згубіў усё чалавечае, я—злодзей, я—распусьнік, я—зьвер... Мне месца ў турме, на катарзе. Я—вораг чалавецтва; такіх, як я, зьніштажаюць. І зьніштожаць мяне, я чую, хутка прыдзе мой час, ён набліжаецца.

Лідачка слухала, скамянелая. Білі яе, цяжкімі ўдарамі білі жорсткія словы Яроцкага, гасілі сьвядомасьць, засьцілалі мазгі атрутнай чмутой. Сам Яроцкі страшным здаваўся, дзікім, нязвычайным. Хацелася бегчы ад яго, уцячы далёка-далёка, каб ня бачыць калючых вачэй, каб ня чуць сухога, рашчэпленага голасу, каб забыцца зусім, выкінуць з уяўленьня яго страшэнны вобраз. І разам з тым ней-

кая сіла цягнула да яго, прымушала стаяць і глядзець, піць вачмі хараство яго дзіўнае. Бо прыгожы ён быў, ярка-прыгожы—гэты зьвер-чалавек.

Яроцкі раптам зьмяніў тон свайго голасу. У ім загучэла мяккая ласка і смутак. Чараваў гэты тон, ірваў сэрца, адбіраў волю.

— Лідачка! Бачыш, хто я такі? Ты не чакала, праўда, не чакала гэтага? Ну, ці скажаш цяпер ты, што любіш мяне, што я табе родны і блізкі? Ці можна кахаць такога, як я? Ці можна кахаць таго, хто ад усіх-чыста адбіўся хто акунуўся ў страшэнную гразь, з якой ня змога ўжо вырвацца?

Бедная Лідачка! Як балела сэрца ў яе, як крышылася, ірвалася на часткі нутро! Шкода яго, дужа шкода, хоць і дрэнны ён, хоць і злачынец. І за што ён абразіў яе, за што пасьмяяўся над яе пачуцьцём? Чаму ён ня верыць ёй, яна-ж заўсёды адну чыстую праўду гаворыць...

Лідачка зноў падышла да яго, мякка ўзяла за руку.

— Віктар. Я ўсё роўна люблю цябе, хоць ты і такі... дрэнны...

А Яроцкі зноў яе адпіхнуў. Зноў засьмяяўся сухім тым драўляным сьмехам... Устаў перад ёй ва ўвесь рост—жорсткі, скамянелы.

— Ха-ха-ха!.. Гэта літасьць, спагада? Шчыра дзякую. Гэтага мне ня трэба. Я спагады не хачу. Я хачу, каб знашоўся такі чалавек, які-б забыўся на ўсё, які-б убачыў мяне такім, як я ёсьць, і такім мяне палюбіў, які-б палюбіў мяне ў гразі, які-б сам акунуўся ў гэтую гразь, быў разам са мной, быў такім, як я... Ха-ха-ха... Табе ня быць такім чалавекам, ты чыстая, ха-ха... ты дабрачынная, ты ня можаш з любым сваім паўстаць супроць усіх людзей, супроць усяго сьвету... Ты—слабая для гэтага.

Тады ня стрывала ўжо Лідачка. Пачуцьцё захлынула палкаю хваляй,—панясло ў вір, у прорву бязвольля, адданасьці. Няпрытомная кінулася яна да яго, плакала, сьмяялася, стала прад ім на калені, цалавала рукі яго. І гаварыла, як у сьне, як звар'яцелая:

— Не гані... я хачу з табой... бяры мяне, рабі, што хочаш... я буду ў гразі, буду дрэнная... Я люблю цябе... Віктар, павер, не гані... Любы мой, даражэнькі...

Тая ноч уся была ў чадзе. Было для Лідачкі новае шчасьце, дасюль нязьведанае, новая радасьць. Быў чорны тлум у галаве, а ў сэрцы—атрута салодкая, чорная. Многа піла яна ў тую шалёную ноч, хмель віна мяшала з хмелем пачуцьця. І слаўся туман у вачох, у галаве, усюды навокал, увесь сьвет у туман

захінаўся—у квяцісты, дрыготны туман. Было новае шчасьце, і была новая Лідачка. Чорная Лідачка была.

Ён загадаў ёй перапрануцца—у мужчынскае, у яго гарнітур—і павёў яе. Яна пашла, не спрачалася. Ён павёў яе ў гразь, ёй было добра, яна хацела быць бруднай і дрэннай.

Сутарэньне гнілое. Лямпачка з адбітым шклом, ад яе размашыста цені—крывыя, дрыготныя. Усё крывое, усё гнілое, пратухлае.

Куды ён завёў?

Ля парога ложак. У брудным шмоцьці варушыцца нешта, стогне, кашляе надрыўна, хліпуча. А там далей яшчэ ложак. На краю дзяўчына з хлапцом. Абнімаюцца, цісънуцца. За імі ў змрочным выблеску лямпы перапляліся агідным карчом кавалкі голага цела.

Падышоў нейкі плюгавы. Упяў свае вочы, сапліва-бліскучыя, сьлізкія.

— Няма больш... Усіх разабралі...

Яроцкі сьмяецца.

— Мы найдзем сваё.

Падыходзіць да дзяўчыны, бярэ яе проста за грудзі. Тая ўхмыляецца, блішчыць на яго тупа-чырвонымі лягушынымі вачмі.

— Чаго лапаеш. Не тваё дабро, дык ня руш.

І потым, яшчэ шырачэй ухмыльнуўшыся:

— Прыгожы які.. Глянь, Мікіта, не раўня табе. З гэткім і дарма кожнай у вахвотку...

А хлапец устаў, злосна глядзіць на Яроцкага.

— Не чапай, грошы плочаны.

Яроцкі сьмяецца.

— Чуеш—дарма... Вось вазьму і адбяру. Пойдзем са мной, га?

Дзяўчына ўхмыляецца.

— Не, мы—чэсныя, мы ня то, што... а раз угаварыліся, дык кончана...

І глядзіць на Яроцкага масьленым поглядам, выпінае мясістыя грудзі. Яроцкі б'е далоньню па іх і адыходзіць. Сядае за стол, вынімае пляшку.

— Эй, абшарпанцы! Частую ўсіх, падыходзь!

Абступілі стол. Яроцкі ўсім налівае, паслаў яшчэ за гарэлкай.

Ажыло сутарэньне. Шалёны сьмех, лаянка, брудныя жарты. Зьмяшалася ўсё, загудзела гамам грамоздным, цяжкім, чорным чадам усіх агарнула.

І Лідачка п'е разам з усімі. П'е пякучую, даўкую гарэлку. Трэба піць. Трэба, каб больш тлуму было ў галаве, каб забыцца на ўсё, на ўсё-чыста, каб да канца акунуцца ў гэта гарачае, чорнае пекла, каб захлынуцца гэтым брудам распусты.

І Лідачка чуе, як унутры ўзмываюцца дзіка-гульлівыя хвалі, як выпіхаюць з грудзей яны крыкі вар'яцкія, брыдкія, як з месца

ўзьнімаюць, штурхаюць у скокі—у крыўляньне агіднае, у выкрунтасы шалёныя голых п'яных простытутак.

— Віктар, глядзі, я таксама...

Рагочыць Лідачка. Сьмешна ёй дужа, што дзяўчаты да яе прыстаюць, жартуюць з ёй, як з хлапцом. Ды так-жа салодка ўхмыляюцца, так пяшчотна лашчуць яе.

— Маладзенькі яшчэ... Зусім яшчэ хлопчык малы... Мо' першы раз?..

Дурныя—ня ведаюць. Дык-жа наце, дзівуйцеся!..

— Віктар, глядзі!

Расшпіліла тужурку, сарочку парвала, паказала грудзі дзявоцка-крамяныя, белыя.

— Ха-ха-ха!.. Чаго-ж расступіліся?.. Бачылі? Бачылі, та?.. Глядзеце, дзівуйцеся!.. Ха-ха-ха!.. Віктар, глядзі! Ці пазнаў?..

У зьвярыным пале выскаляюцца жоўтыя зубы мужчын. Грабаюць рукамі шурпатымі, лезуць з усіх бакоў.

— Эй, хто мацнейшы... бяры! Ха-ха!.. Віктар! Чуеш, Віктар?..

Шкумацяць, ірвуць, вырываюць. Ці-ж гэта людзі? Гэта-ж—зьвяры, гэта-ж—жывёлы. Ага, вось Віктар, вось яе зьвер, самы дужы, самы рашучы. Яе любы самец. Што, расступіліся? Страшна? Спалохаліся? Ён, адзін ён толькі возьме яе, яму толькі дасьць яна ўцеху.

— Любы мой!

Ён бярэ на рукі яе. На ложак нясе. Тут, у брудзе гэтым, у пекле, на вачох у гэтай разьюшанай зграі...

Ат, хай, што хоча. Яна яго, ён узяў яе, заўладаў ёй па праву дужага, сьмелага.

Хай робіць, што хоча.

. . . .

Белы дзень чаду ня любіць. Белы дзень жорстка зрывае плёнкі з ачэй, паказвае сьвет, як ён ёсьць. Раніцой зьнікаюць ночныя хварбы-яскравасьці і на іх месцы астаецца адна бледная хворая сінь. Раніцой—прапітае, прагарэлае сэрца абдаецца золкай цьвяроасьцю і сьціскаецца ў холадзе белым.

І тады мокра садніць нутро.

А Яроцкаму дзень—яшчэ новы прыступ напорнай трывогі, новы наплыў цьвярозых назольлівых думак. Таму й цяжарыла яго Лідачка, таму й лішняй, непатрэбнай, дакучнай была прысутнасьць яе.

У Лідачкі пад вачмі адвісла сінелі мяшкі, а на распухлым твары расплыліся ў бліскучым поце гразёвыя плямы.

Як адпраўляў Лідачку Віктар да хаты, яна не пярэчыла. Яна тупа, алавяна зірнула на яго і толькі сказала, выходзячы:

— Як баліць у мяне галава!

Папалуднаваўшы, Шчупак з гадзіну адпачывае. Потым чэша сваю бараду, шмальцуе шчодра фіксатуарам і наогул прыводзіць да ладу сваю асобу. Потым нясьпешна, паважна, азіраючы гаспадарлівым вокам вітрыны, ён ідзе праз увесь горад да Ніны.

Добра ў Ніны, у яе цесным, прытульным пакойчыку. Добра таму, што тут ціха і цёпла. Не ад печкі цёпла—не, печка рэдка паліцца ў Ніны. Цёпла ад вачэй Ніністых—мяккіх і чыстых, ад яе голасу ветлага.

Ніна заўсёды занята. Але Шчупак не замінае ёй. Яны разам працуюць. Ніна чытае ў голас, да залікаў гатуецца, а Шчупак сядзіць моўчкі і слухае. Ды яшчэ глядзіць на яе, ня зводзіць вачэй. А калі засынае ён часам, Ніна ў нос яму пстрычку дае або цягне за бараду. Тады Шчупак глыбока сьмяецца, вельмі здаволены й рады.

Часамі-ж бывае, што ў Ніны зьбіраюцца хлопцы, дзяўчаты, таварышы па вучобе. Цесны пакойчык поўніцца гоманам, сьмехам, песьнямі дружнымі. Тады хвалюецца ўзмывамі радасьці хмель маладосьці, рассыпаецца звонам гульлівым весялосьць маладняцкая, бурная.

Эх, жыцьцё ты студэнцкае! У тваёй упартай штодзённшчыне ці-ж мала красы,

пераліваў сьвежых, рунёвых! Ці-ж мала красы ў гэтым поступе дружным, напорным, у гэтым гарачым імкненьні наперад, далей і вышэй па дарозе да сонца, да шчасьця!

А бурлівасьць твая неспакойная... Хто адважыцца загасіць гэты агонь, гэта кіпеньне нястрыманае, гэты магутны бой маладога сьвежага сэрца!

Чую, чую ў гэтай напорнай бурлівасьці сталёвыя ўзмахі машын і жніўныя песьні, як ядраны звон вячэрняй зары.

Калі моладзь зьбіраецца ў Ніны, тады цесна ў яе, недзе зусім павярнуцца. Тады Шчупак узлазіць на шафу і адтуль добрадушна ўсьміхаецца.

Ён больш за ўсё любіць, калі моладзь пяе. Песьні гэтыя дружныя так прыемна ўзбураюць нутро, так уздымаюць настрой. Сэрца ад песень бывае сьвежае, поўнае, ад іх хвалі дзівоснай салодычы па нутры расплываюцца, ад іх і сьляза набягае на вочы.

Хочацца Шчупаку самому быць маладым, такім, як гэтыя хлопцы, дзяўчаты. Хочацца, каб і ў яго было нешта наперадзе—вялікае і нязнанае.

І шкода, шкода нязьлічаных дзён, засушаных шэрай будзёншчынай.

Быў адзін дзень, калі Шчупак асабліва шчыра часаў сваю бараду. У гэты дзень, ідучы да Ніны, ён у вітрыны ўжо не глядзеў, а пахмура, упарта ўзіраўся пад ногі сабе, у лядзяна-шурпаты дол. Ішоў марудна, сагнуўшыся. Мусіць, настойна думаў аб нечым.

З Нінай ён прывітаўся неяк суха, пасьпешна. Сеў на сваё месца і пачаў слухаць. Ніна чытала політычную экономію, гэта давала яму поўнае права драмаць. Але ён не драмаў. Ён бесьперастанку варочаўся ў крэсьле, соп і ўздыхаў. Урэшце Ніна гэта заўважыла, запытала троху дасадліва:

— Чаго не сядзіцца вам? Вы, мабыць, сказаць нешта хочаце?

— Я ня ведаю... Я хацеў пагутарыць з вамі.

— Давайце.

Шчупак усё комчыўся, адводзіў нерашуча погляд ад вясёла-дапытлівых ачэй Ніны. Урэшце пачаў. Глуха неяк, быццам сярдуючы.

— Ніна...

— Га?

— Ніна...

— Што?

— Я ня ведаю... можа я... вас... люблю...

Ніна—проста так, нібы-то што:

— А можа й любіце, хто-ж вас ведае.

І ўсьміхнулася. А Шчупак зноў закомчыўся. І потым з патугай зноў забубнеў:

— Я думаў... я хацеў вам сказаць... я ня ведаю...

І выпаліў раптам, духу набраўшы:

— Каб вы маёй жонкай былі...

Ніна зарагатала адразу. Але ўраз перарвала сьмех, загаварыла сур'ёзна, чула і ласкава:

— Я вам праўду скажу. І я к вам прывыкла. Мне нават сумна, калі вы ня прыходзіце. Але давайце яшчэ пачакаем. Яшчэ троху прыгледзімся адзін да аднаго. Добра?

Шчупак ня мог нічога сказаць. Ён захліпаўся ад радасьці, ён хацеў, каб маўчаць цяпер, абодвым маўчаць. Каб у салодка-пявучай цішы доўга, бясконца жыў гэты момант, гэты вясёлкавы выблеск цёплага шчасьця.

У той вечар Шчупак варочаўся да хаты з высока паднятай галавой, з шырокай задаволенасьцю ў круглых вачох. Сьняжынкі гарэзныя, ясна, вясёла мільгаючы ў сьвятле электрычнасьці, пырхалі плоймай наўкола яго, асядалі на твар сьцюдзёнымі кропкамі. Зналі, пэўна, дуроніцы, што толькі цяпер і жартаваць з чалавекам, калі яму ўсё так люба, так міла на сьвеце. Зналі сьняжынкі гарэзныя, што ў такія шчасныя моманты чалавек ня твар, а нутро ўсё гатоў адкрыць, расхрыс-

таць, каб захапіць, увабраць у сябе ўсю радасьць жыцьця, каб нутро спаласнулася ветрамі сьвежымі, сьвежым ядраным подыхам сілы жыцьцёвай.

Эх вы, сьняжынкі, любуткі мае!

А прышоўшы да хаты, Шчупак заняўся зусім нясуразнаю справай. Ён выцяг з-пад ложку распухлы стары чэмодан, адчыніў сваю шафу з дзьвярамі віхлястымі і пачаў перабіраць сваё халасьцяцкае дабро: сурдуты падраныя, такія-ж сарочкі, штаны, чаравікі, анучкі, кніжкі, век нячытаныя, каўняркі папяровыя, рыжыя і г. д.

Напасьледак браў новы гарнітур і надзяваў яго спакваля, асьцярожна, доўга ўзіраўся ў люстэрка, хадзіў па пакою.

Потым склаў усё акуратна, разьдзеўся і лёг.

Калі ляжыш адзін у халодным пакоі, калі ўкрыешся з галавой цёплаю коўдрай, тады празрыста і востра сябе адчуваеш, тады пачуцьці скупяцца неяк, выпукляцца, стануць фізычна-адчувальнымі. Тады й аддаешся ва ўладу ім, тады й дазваляеш ім плысьці свабодна ў нутры, толькі слухаеш, прыслухоўваешся.

Шчупак адразу чуў толькі радасьць. Радасьць была бязьмерна-жывая, пякучая. Такая радасьць, ад якой хочаш корчыцца, хочаш пішчэць, хочаш упіцца ў коўдру зубамі.

І прыгажэў, усё прыгажэў у ваччу вобраз любае, добрае Ніны. І ўсьміхалася краскамі яснымі жаданае, недалёкае.

Было так адразу. А потым сьцюдзёнае, чорнае балюча ўелася ў сэрца. Празьвінела спачатку нясьмелым ледзь чутным водгукам, потым расло і расло, як перад бураю хмары цяжкія на небе. Задушыла радасьць, паўстала пагрозаю жудаснай.

— Злодзей-жа я... Мо' заўтра ў турму... Як я сьмеў? Як я адважыўся нават казаць ёй аб гэтым?.. Злодзей я, злодзей паскудны...

...Цяжка зьнібела сэрца. Трудна ўлежаць было, хацелася ўстаць, нешта зрабіць, нешта паправіць. А хоць уцячы куды-небудзь. З ёй, з любаю Нінай. Пайсьці да яе і сказаць:

— Я злачынец. Мне больш няможна тут заставацца. Хочаш—паедзем з табой, паедзем у сьвет, будзем шукаць сабе долі?

І тады—куды-небудзь у далёкую дзікую краіну, дзе зусім мала людзей, дзе ня трэба ні грошы, ні службы, дзе працаваць толькі трэба, шчыра працаваць. Там, далёка-далёка, яны саўюць гнязьдзечка сабе, будуць шчасьліва жыць удваёчку, ніхто не пакрыўдзіць іх, не ашукае. Ён будзе любіць яе, будзе берагчы ад дзікіх зьвяраў, будзе здабываць ёй яду. А яна таксама будзе любіць яго й шанаваць...

І аддаўся Шчупак думкам ружовым, марам нязбытным. Яны яму радасьць вярнулі.

15

Ірвецца разьюшаным зьверам бура-завея. Падмывае сьцены стогнам злавесным, на вокны кідаецца, шморгае сьнегам, сіпіць у злосьці бясьсільнай.

Штс ёй трэба, гэтай буры-завеі? Чаго так настойна яна дабіваецца ў хату, к Яроцкаму? А мо' гэта ня бура зусім? Мо' гэта ўжо падышла, агарнула сіла тая магутная, што гудзела ўсё небясьпекай, што зьвілася над яго галавой жудасным роем, што гняла, прыціскала трывогай бязьмернай?

Б'ецца, дабіваецца ў вокны, дыхае хрыпла лютасьцю, гневам.

А тут у пакоі ціша. Як гэта страшна, як жудасна. Здаецца—гэта ціша наўмысьля падкралася, наўмысьля абвіла зачарованым колам, каб адкрыць яго, вылучыць, паказаць на яго злорадасна:

— Во ён! Глядзеце! Дзяржэце!.. Во—злодзей, разбойнік!..

Жудасна. Страшна.

Сёньня трывога зьбілася ў камлыгу грамоздную, прыдушыла цяжка, бязьлітасна. Куды ўцякаць, куды дзявацца? Страх атачыў, страх упіўся ў сэрца гадзюкаю чорнай, уліў у нутро атруту бязвольля адчайнага.

Сёньня апошні бой. Жыцьцё ці сьмерць. Ці краты, ці вольная воля, раздольле шырокае.

На стале тлуста разбухлі тоўстыя кнігі. Старонкі рабыя едка выскаляюцца вострымі лічбамі.

Лічбы, лічбы, лічбы...

Няўжо ў іх, у гэтых мізэрных, нікчэмных значкох яго доля? Няўжо гэта яны—во гэтыя самыя дробненькія, востранькія кручочкі— зьявяцца моцнымі непадкупнымі сьведкамі злачынства яго, няўжо іх заява маўклівая кіне яго за жорсткія краты турмы?

Не, ён ня здасца... Ха-ха! Ён добра ведае лічбы, ён ведае, як іх прымусіць маўчаць, як пераняць на свой бок гэтых маленькіх хітранькіх сьведак. Яны яго слухаюць, яны ведаюць сілу яго, ён імі арудуе, як добры гулец шахматнымі пешкамі.

Трэба толькі заспакоіцца, пазбыцца гэтага страху, трывогі. Потым напружыць розум і зрабіць некалькі гэніяльных хадоў. Яны зьявяцца ў яго галаве, ён пэўны ў гэтым. Толькі каб заспакоіцца. І тады паслухмянай чаргой у жаданым парадку пастрояцца лічбы і завіляюць угодліва кругленькім хвосьцікам даўгія драбіны балянсаў.

Ха-ха! Думаюць лічбамі зловяць, бухгальтэрыяй спутаюць.

Толькі вось гэта завея. Нашто яна так злавесна крычыць, нашто пагражае так жудасна, страх у нутро наганяе?

Хіба вокны завесіць? Так, будзе лепей.

Яроцкі завешвае вокны шчытнымі коўдрамі. Слухае. Бура адбегла нібы, скавыча здалёка ціха і жаласна, як набіты шчанёнак.

Цяпер працаваць. Цяпер добра зусім, ціха й спакойна.

Яроцкі сядае за стол. Гартае пасьпешна шырокія аркушы, упіваецца востра вачмі ў радочкі шурпатых лічбаў. Прагна шукае, ловіць патрэбнае, перабягае дасадліва па непатрэбных слупкох. Напружна працуюць мазгі, перакідаюць лёгка і спрытна лічбы-кручочкі, строяць комбінацыі розныя. Здаецца— момант яшчэ, і будзе адкрыта выйсьцё, і загавораць тлуста-разбухлыя кнігі новай гаворкай—вясёлай і радаснай.

І раптам недзе глыбока-глыбока, пад сэрцам ці што, затачыў чарвячок. Паплыла па ўсім целе шурпатая нейкая млосьць, адзервянеласьць балючая. І захапіў усяго, замуціў галаву страх агнёвы, страх зьвярыны, шалёны. І загудзела жудасным гудам трывога, узьляглася, прыціснула гнётам страшэнным, задушыла волю, сьвядомасьць.

А завіруха за вокнамі зноў напірае, зноў дабіваецца. Праз шчытныя коўдры чуваць,

як ляпае злосна па шыбах, як вые, гвалтуе пагрозна, адлятае на момант, каб разагнацца, каб з новай сілай ударыць, каб сьцяну праламіць, каб насьцігнуць, злавіць, разарваць у шкумацьце.

А мо' гэта ворагі? Мо' гэта людзі сабраліся там за акном, усе людзі, увесь сьвет, прышлі на расправу з ім, злосным злачынцам? Мо' сьцерагуць, падцікаюцца, мо' ўжо й тут, пад дзьвярмі? Ці замкнуты хоць дзьверы?

Ага. Дзьверы замкнуты. Ён не адамкне. Ён ня пусьціць нікога. Хай дабіваюцца. І ня здасца ён ні за што. Біцца будзе, кусацца, зьверам лютым кінецца на таго, хто першы ўвойдзе.

А якая-ж па целе балючая млосьць расплываецца, слабасьць якая! Ногі дрыжаць, трэба сесьці. Трэба падумаць—спакойна так, ціха.

І чаго ён узрушыўся так? Нічога-ж няма. Гэта вецер там вые, завіруха сягоньня, сьнег пэўна вялікі йдзе. А за дзьвярмі, ён-жа ведае добра, няма нікагутка. Суседзі ў кватэрах сваіх, чаго ім бадзяцца тут. Вось адпачнуць цяпер троху і тады зноў працаваць. Трэба-ж як-небудзь кнігі падвесьці. Напружыцца троху—і будзе ўсё добра. І небясьпекі ніякай ня будзе. Тады—паехаць адсюль, у другі горад, да новых людзей, да новых уражаньняў.

Яроцкі зноў сядае за стол. Зноў гартае слухмяныя аркушы, зноў спрытнай, лёгкай чаргой перасыпаюцца лічбы ў мазгох, усплываюць павольна комбінацыі стройныя.

І зноў гэты едкі там, у нутры, чарвячок. І зноў шурпатаю хваляй мурашкі па целе. Зноў—страх агнёвы, трывога нямая.

Бегае зноў па пакою, кідаецца зьверам загнаным.

— Не, так няможна. Гэта—нэрвы. Трэба легчы, троху спачыць.

Лажыцца ніц, галавой у падушку. Лажыцца і чуе, што ўжо ня зможа ўстаць, ня зможа крануцца, падняць галаву ад падушкі. Бо абступіла сьцяной цішыня і ў цішыні гэтай старожкасьць, затоенасьць страшная. Здаецца, не цішыня гэта ў пакоі, а туга напятыя струны. Адно зварухнуцца і зазьвіняць, загалосяць, заенчаць, напоўняць пакой дзікім, жудасным голасам—стогнам.

І ляжыць нярухома застыгла, толькі твар глыбей уціскае ў падушку.

Раптам нехта ляпае ў дзьверы.

— Што? Хто гэта?

Ці адчыняць, ці не? Мо' ляжаць так прытоена—падумаюць, дома няма?..

Яшчэ ляпае. Ціха, нясьмела. Так ляпаюць дзеці, калі йдуць да сярдзітага настаўніка. Не, трэба пайсьці адчыніць.

Засыпаная сьнегам фігура. Галава хусткай глуха завязана. Хто гэта?

Лідачка!

— Што табе трэба?

— Не гані, Віктар, я прышла к табе, бо ня змога ўжо больш. Я зусім прышла, рабі што хочаш са мной. Не гані толькі, Віктар, ня трэба...

Яроцкага злосьць забірае. Гэтыя пакорныя сьлязьлівыя вочы, як у сабакі. Мяшкі пад вачмі. Твар мокры ад сьнегу, ад сьлёз. Як надаела яна!

— Слухай! Мне зусім няма чаго з табою рабіць. Не да цябе мне цяпер. Ідзі, ідзі, калі ласка, мне часу няма...

Яна на калені кідаецца. У яе зноў сьлёзы, патокі цэлыя сьлёз. А вочы... міргаюць неяк убога, жаласна. Што яна—маліцца надумала?

— Кінь, калі ласка. Ня трэба гэтага зусім. Мне так цяпер некалі, што зусім не выпадае вазіцца з табой.

— Віктар, нашто ты... ціха, не кажы так... Мо' ты жартуеш?.. Чаму ты ня так, як тады, як раней... Любы мой, родны... што хочаш рабі, толькі так не глядзі на мяне... Я не сабака, Віктар, я—чалавек... Ты казаў, што кахаеш мяне... казаў-жа, праўда? Ня сон-жа гэта быў?.. Не-не, не гані, ня трэба... Пачакай... Ты кажаш—заняты... дык я знаю... Я ня буду

перашкаджаць... я буду сядзець так ціхенька-ціхенька. Мне толькі каб глядзець на цябе... я ня буду перашкаджаць, далі-бог. Калі што, дык прагані тады, я пайду... Мне-ж дужа хочацца, Віктар, пабыць з табой, паглядзець на цябе... Добра, Віктар, ты не прагоніш?

— Ха-ха-ха! Ці ня досыць ужо, мая мілая? Здаецца, час ужо кончыць комэдыю гэту. Скажу проста табе: ты мне абрыдла, ты зусім надаела мне. Ну, пагулялі, пазабавіліся, але-ж усяму ёсьць канец. Не жаніцца-ж мне з табой... ха-ха... Ты, пэўна, думала—век мы з табой будзем кахацца. Дый не кахаў я зусім. Не набярэшся каханьня на ўсіх... Зразумела?

Лідачка ўстала. На твары жудасна застыгла непаразуменьне. Вочы—тупыя, алавяныя. Так, як тады, пасьля ночы тэй бурнай.

— Добра... я знаю... ты проста хацеў мяне пагубіць... я табе верыла, я ня знала... Я думала, што ты добры...

Яроцкі нецярпліва здрыгнуўся.

— Эх, старая песьня. Пагубіць... Проста пазабавіцца трэба было. А ты мне, праўда, падабалася. Ты была прыгожая, сьвежая дзяўчынка, хе-хе... Ну, але годзе ўжо. Некалі мне. Бывай!..

— Ціха, ціха, Віктар... Пачакай... пачакай...

Яна нібы думала нешта, нібы напружна старалася нешта згадаць. Стаяла—ціхая і бяз-

уважная, працятая нейкай халоднай марудласьцю. У вачох расла сухая, бяздонная пустата.

— Ага... так... я пайду... я зараз пайду, пачакай... Віктар... бывай...

Павярнулася і пашла—ціха, нячутна, як здань. Здалося Яроцкаму, што, выходзячы, усхліпнула неяк затоена, сьціснута, як дзіця над ложкам хворае маткі.

А мо' гэта ўсхліпнула бура там, за акном, у злосьці бясьсільнай зьнямогшыся?

Яроцкі пачаў хадзіць па пакою. Паволі раставала ў нутры ўражаньне стрэчы з Лідачкай. Далей і далей адлятаў яе вобраз. А спачатку, дык здавалася ўсё, што стаіць яшчэ тут, у дзьвярох, што глядзіць пустым сваім, зьдзервянелым поглядам, што шэпча ўсё бесьперастаньня:

— Я пайду... я зараз пайду... пачакай...

Ад Лідачкі думкі зноў пераходзяць да кніг, да лічбаў, да небясьпекі. Страшна цяпер гэтых кніг, страшна да іх падыйсьці. Упэўненасьць нейкая ў тым, што нічога ня выйдзе, што зноў апануе дзікі, шалёны страх, што зноў пагрозна, страшэнна загудзіць завіруха.

Няма спакою, няма пэўнасьці. Ня выйдзе нічога, ня можна так. Ат, трэба кінуць сягоньня. Легчы, заснуць, а ўраньні будзе бадзёрасьць,

будзе настрой. Ня трэба сьпяшацца, ёсьць яшчэ час.

Яроцкі зноў кладзецца на ложак. Слухае, ці ня зьявіцца зноў той страх, тая напятасьць ціхая, жудасная.

Не, цяпер лепей. Цяпер цішыня мякчэйшая, цёплая. Выцьцё завірухі далёка, ня кратае ўжо, не наганяе спалоху. Цяпер толькі заснуць. Сьціхамірыцца, вочы заплюшчыць, і зараз—туман такі вязкі, прыемная млявасьць. Як звычайна.

А мо' не засьне? Мо' не дадуць турботныя думкі?

Балюча дрыжаць павекі. Трудна, вочы заплюшчыўшы. І ў галаве празрыстая яснасьць, цьвярозасьць. Думкі плывуць стройным ладам. Трэба наўмысьля парваць іх, пераблытаць, каб, як у сьне, абрыўкі былі стракатыя, квяцістыя.

Напружваецца Яроцкі, хоча сябе затуманіць, хоча заснуць. Ад гэтага сон яшчэ далей адлятае, яшчэ больш у галаве празрыстае яснасьці. Чуе гэта Яроцкі, і злосьць яго ахапляе. Не ляжыцца на месцы, варочаецца ўсё, шукае выгаднейшае позы.

Па калідору настойна выбіваюцца крокі. Бліжэюць. Ці не к яму? Ці замкнуты дзьверы? Не, забыўся, пакінуў так, нязамкнутыя.

Ахапляе незразумелы, дзікі спалох. Зрываецца з ложка, бяжыць да дзьвярэй. На парозе Шчупак.

— Добры вечар, Яроцкі! Ты яшчэ ня сьпіш?

— Ня сплю. Што табе трэба?

— Павіншуй мяне, друг Яроцкі...

— Што такое?

Шчупак становіцца ў сьмяхотна-важную позу, хоча гаварыць урачыста й павольна, але захлiпаецца радасьцю...

— Яроцкі! Я—жанюся! Я...

І пішчыць ад захапленьня, кідаецца да Яроцкага, лезе ў твар барадой. Яроцкі яго халодна спыняе.

— Што-ж, гэта добра... Жонка ў турму будзе есьці прыносіць.

— У турму?

— Ха-ха! Абмяк, асалапеў, дурань стары... Іш, разгуляўся, жаніцца надумаў.

— Так, даражэнькі. Нічога ня зробіш... Прыдзецца нам з табой сесьці... Але ты жаніся, гэта ня шкодзіць.

Шчупак скругліў свае вочы, упяў бязглузда ў Яроцкага. Задзіўленьне тупа застрала ў іх, задзіўленьне й спалох. Гэта ў вачох. А па вуснах зьбялелых, пакрыўленых боль працякла, пакута вострая. Дзе тая дзелася радасьць!

Яроцкі ад яго адышоўся, захадзіў узад і ўперад. Садніла нутро злосьцю нейкай соленай,

едкай. Усё нялюбае, агіднае, усё нэрвы скрабе, назаляе страшэнна. І гэты дурны барадач... Чаго ён стаіць там, як пень, гаварыў-бы, ці што. Спалохаўся, зьмяк.

— Слухай ты, жаніх барадаты... Доўга ты будзеш стаяць тут?

— Яроцкі! Мо' ты жартуеш?..

— Ха-ха... Вядома, жартую... Дзе-ж мы з табой пападземся! Ого!.. Ты за мной, як за каменнай сьцяной... Чуеш? жаніся, кажу... Вясельле згуляем, зададзім банкет на ўвесь сьвет, возьмеш гэта ты красную сваю, пацалуеш яе, яна цябе тож пацалуе, ну і ўсё іншае, што паложана. Эх, дабро!.. А тады, каб лепш адчуваць мядовы месяц, можна і ў турму, тож ня дрэнна, ха-ха... Я цябе бачу, а ты мяне не... Ну, годзе... Марш за гарэлкай... будзем піць, будзем гуляць сёньня заручыны... ха-ха-ха...

— Яроцкі, ня сьмейся.

— Ня сьмейся... А калі весела мне, што-ж я плакаць буду, ці што? Ну, ідзі, прынясі... Вып'ем, дык і ты засьмяешся...

Шчупак моўчкі пашоў. Яроцкі хадзіў усё па пакою. І сапраўды, быццам весела стала. Ня то што весела, а ўзьнятасьць, гульлівасьць загарэлася нейкая. Шчупак такі сьмешны, такі недалужны... Пажартаваць над ім трохі, пакпіць. Павадзіць за нос жаніха... Забава, пра-

цягнецца час неўзаметку. А заўтра з сьвежай сілай за працу. Дзень прынясе яснасьць, цьвярозасьць. Няма чаго турбавацца.

Вярнуўся Шчупак. Прынёс гарэлкі. Яроцкі наліў шклянку і выпіў узапар. Прапаласнула нутро жывая цяплынь, расплылася па жылах салодкім агнём.

Шчупак ня п'е. Трэба прымусіць...

— Пі, Шчупак, усё-роўна прапалі...

— Не хачу я, Віктар...

— А я кажу—пі!

— Не магу!

— Пі, сьцерва!

— Ня буду...

— Ня будзеш? Ня будзеш? Ага...

Устаў, падышоў да Шчупака. Замахнуў кулаком.

— Будзеш піць, га?

І раптам скалануўся ўвесь, задрыжэў. У ваччу цёмна стала, толькі барада Шчупакова віхлялася плямай выразнай, чорнай. Невядома: ці то ашаламіла новая, страшная думка сваёй нечаканасьцю жудаснай, ці мо' магчымасьць лёгкага выйсьця захлынула радасьцю дзікай, зьвярынай.

Падышоў да стала, яшчэ выпіў поўную шклянку. На Шчупака не глядзеў, ня мог цяпер зірнуць у той бок. Здавалася, што Шчу-

пак пачуў яго думку, што моўчкі сочыць за ім, чакае.

У Яроцкага ў вачох заблыталася. Дзіўна як: п'яны, здаецца, у целе тупасьць нямая, разбухлая, у галаве шаломны туман. А думкі ня зьбіваюцца, думкі йдуць так роўна і зладна, як у цьвярозага. Нават асаблівая моц у іх, вострая ўпартасьць.

І разважае, мяркуе. Гоніць, штурхае напорныя думкі.

— Тады сказаць—забраў усё... Нашто? А мо' хацеў, каб ня было ніякіх канцоў, ніякіх зачэпак... Ды мне якое дзела? Няма кніг, няма нічога...

— Так... добра... кончана... толькі ўраз...

Ён абярнуўся да Шчупака. Іх погляды стрэліся. Гэта быў адзін кароценькі момант, адзін толькі міг. Але ў ім было поўна нечалавечай напружнасьці, дзікай напружнасьці, якая востра напяла, зайстрыла інстынкты, падняла іх на тую ступень, дзе страшэнная зьвярыная прастата, дзе адчуваецца толькі голая вузкая мяжа паміж сьмерці й жыцьця, дзе й гэтая мяжа во-во, здаецца, зьнікне, сатрэцца.

Так было адзін міг. І Шчупак ня вытрымаў. Ён закрычаў дзікім, прарэзьлівым голасам. Мо' гэтым зьбянтэжаным гвалтам ён паблізіў канец? Мо' гэты бясьсільны спалох, што міжвольна вылецеў з горла енкам сьмя-

ротным, стаў жудасным заклікам, сыгналам Яроцкаму?

Ён, як дзікая кошка, кінуўся на Шчупака, за горла схапіў, паваліў на падлогу. Ня помніў нічога цяпер, лютасьцю страшнай мазгі замуціліся. Адно—душыць, мацней, яшчэ мацней душыць, каб толькі хрыпеў, каб ня мог падаць голасу, каб хутчэй перастаў шаваліцца.

І ня чуў, не заўважыў, як схапілі адзаду, адвалаклі. З момант стаяў нярухома, шалёна варочаючы страшнымі дзіка-выпятымі вачмі, быццам ня знаў, шукаў, за што ўзяцца, куды кінуцца. Потым напружыўся ўвесь, ірвануўся. Туды, да яго. Шаволіцца-ж, корчыцца вунь на падлозе. Раструшчыць яго, разарваць, растаптаць.

Не, мала сілы. Здужалі, скомчылі. Не даюць зварухнуцца. Вязаць пачалі.

Эх, прапала ўсё-чыста! Ня ўмеў, ня здолеў, засыпаўся... Ух, дурань набіты!

А Шчупак корчыцца, напінаецца, хоча ўстаць. І ўсё тыркае пальцам у яго, усё хрыпіць голасам, здушаным злосьцю і болем:

— У турму яго... Гэта—разбойнік. Ён задушыць хацеў... Ён мяне пакалечыў... Злодзей! Забойца!.. Грошы ўкраў ён, казну абакраў... Таварышы, трымайце мацней, ён уцячэ... Ён хацеў задушыць, каб не накрылі яго, каб ня

выказаў я... Родненькія, ня пускайце, ён заб'е, задушыць... Трымайце!.. Трымайце...

Гэты сьлязьлівы, сьлюмачлівы енк Шчупака чамусьці заспакойваў Яроцкага, сунімаў яго абурэньне. Злосьць ападала, на яе месца ў нутры разпаўзалася мокра агіда. Ужо ня кідаўся, ня рваўся—стаяў халодны, застыглы, з пагардлівай усьмешкай на вуснах. Як выводзілі з хаты, кінуў яшчэ адзін погляд на Шчупака, засьмяяўся сухім, жорсткім сьмехам:

— Ха-ха... Ня турбуйся, дурань стары... У турме будзем разам.

16.

Вось і ўвесь сказ пра Яроцкага—голага зьвера. На канчатак раскажу яшчэ казку адну. Я ня ведаю: чуў я дзе-небудзь яе, ці мо' выдумаў сам. Але гэта ўсё роўна.

...У лесе гушчарным, дзе глуха разьліўся салодкі пах сьвежасьці волкай, расла маладая бярозка. Яна вырасла на бураломе, яе тонкі камель хаваўся ў трухлявым вецьці гнілых паваленых дрэў. З гэтага вецьця гнілога яна прагна цягнулася ўвысь, бо бачыла там прыгожае, яснае сонца, бо там, угары, было сьветлае мора блакіту і адтуль прылятаі к ёй чароўныя песьні-званочкі,

ласкавыя і прыветныя, як ранічны шолах гарэзнага ветрыку.

Ад гнілога гальля, што зьвілося агідным карчом у нагах у бярозкі, ішоў дрэнны пах. Мо' таму й цягнулася яна так прагна ўгару, каб ня чуць гэтага паху, каб набраць у маладыя грудзі свае сьветлага, чыстага паветра, што так глыбока ўлілося ў гэты бяздонны блакіт. І часта марыла маладая бярозка аб тым, каб выбрацца вон з буралому, каб выйсьці ў прастор, каб хоць туды, да таго маладога дубка, што разгарнуў так вольна суччa сваё на блізкай палянцы. О, як-бы яна расьцьвіла, закрасавала сьвежай сваёй зелянінай, як засьмялялася-б сонцу сваімі шаўковымі лісьцямі.

Але сілы няма—ня змога. Зьвязала слабыя ногі вецьце старое, трухлявае, адабраў волю гэты атрутны гнілы дух.

І вось нешта раз прышоў да бярозкі злы лесавік, жыхар цёмнага дрыгвянога балота. Ён прышоў, убраны ў вадзяныя лілеі—у краскі прыгожыя, яркія. Прышоў і сказаў:

— Ты мне ўпадабалася. Хадзі да мяне, у мяне многа багацьця і сілы. Я зраблю так, што на тваіх прыгожых галінках вырастуць кветкі, ты ўбярэшся ў

чароўныя дзіўныя ўборы, ты закрасуеш красою нябачанай.

Затрапятала радасна бярозка сваім лісьцем шаўковым, пацягнулася даверліва к лесавіку—злому духу балотнаму. І лесавік ўзяў яе к сабе на балота. Ён абсыпаў яе ўсю лілеямі-кветкамі, увабраў у ўборы чароўныя. І яна стаяла бязьмерна шчасьлівая, поўная радасьці яснай, глыбокай. Яна думала, што знашла сабе долю, знашла сабе шчасьце.

Але прышоў час, і бярозка надакучыла лесавіку. І вось ён прышоў да яе і пачаў сьмяяцца над ёй, пачаў гнаць з свайго логава—з балота дрыгвянага, цёмнага. На ім ня было цяпер кветак, ён быў у звычайным выглядзе сваім—страшны і жудасны. Бярозка яго не пазнала. Ёй стала страшна, яна закалацілася ўся ад сполаху. І пасыпаліся з яе кветкі-лілеі. А разам з імі пасыпаліся і лісточкі яе, бо пажоўклі яны, бо атруціліся лёкам балотным. Хацела бегчы бярозка з балота ды не змагла. Зацягнула твань яе карэньне, загрузьлі яны ў глебе дрыгвянай. І засталася бярозка расьці на балоце.

Яна не памёрла. Яна жыла яшчэ, дажывала. Толькі вецьце яе—каліась та-

кое зялёнае, сьвежае—цяпер засьвіцілася пруцьцем счарнелым, бо ападалі ўсё, сьцякалі бясконца сьлязьмі на брудны дол апошнія ж лісточкі.

А камель пакрывіўся, згарбаціўся, парасьлі на ім валдыры страшэнныя, дзікія. І дуплё гнілой пустатой зачарнелася...

Вось і ўся казка...

Гэта пра Лідачку...

А Ніна вучыла політэкономію.

Таго-ж аўтара:

1. **У віры жыцьця.** Апавяданьні. БДВ 1925 г.
2. **Пела вясна.** Апавяданьні. Выд. „Маладняк“ 1925 г.
3. **Пад сонцам.** Апавяданьні. БДВ 1926 г.

Цана—35 кап.